КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 47 (270) ◂ 16 снежня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144




**ДА І ПАСЛЯ БАЛОТНАЙ ПЛОШЧЫ**

Стар. 11

**МЫ ПАСЛЯ БУДЗЕМ ВАС СУДЗІЦЬ**

Прадстаўнікі ўладаў не знайшлі, што адказаць на пытанні жыхароў наконт забудовы сталічнага Парка дружбы народаў

Стар. 6

**У ЭФІРЫ ГРАМАДЗЯНЕ**

30 гадоў таму Франсуа Мітэран дазволіў французам ствараць грамадскія FM-станцыі. З супрацоўнікам адной такой радыёстанцыі Аляксандрам Чукаевым размаўляе журналіст «НЧ» Алег Новікаў

Стар. 13

**КАЛЯДНЫЯ НАДЗЕІ БЕЛАРУСКАГА РОКА**

Стар. 15

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!**

**ДА НОВАГА ГОДА МОЖНА ПАСПЕЦЬ ПАДПІСАЦЦА НА «НОВЫ ЧАС» ПА СТАРЫХ КОШТАХ!**

▸ АД РЭДАКТАРА

# ВОБРАЗ ПЛОШЧЫ–2010

*Аляксей КАРОЛЬ*

**Плошча–2010 — менавіта пад такой назвай драматычныя падзеі на плошчы Незалежнасці 19 снежня 2010 года ўжо ўвайшлі ў гісторыю. Але не адбалелі, не забыліся, не сцішыліся. Яны застаюцца жывой, пульсуючай з'явай сучаснасці, якая ўплывае на стан грамадства, на лёсы людзей і лёс краіны.**



Вобраз Плошчы–2010 у трактоўцы афіцыйных структур — спроба перавароту. Вобраз Плошчы–2010 ва ўспрыняцці беларускай грамадскасці — спроба мірнага выхаду з таталітарнага тупіку, у якім Беларусь затрымалася на лішніх 20 гадоў.

На Плошчы–2010 сышліся ў адзіным парыве беларускі адраджэнскі рух да незалежнасці, дэмакратычныя памкненні грамадства да свабоды і сацыяльныя жаданні насельніцтва.

Плошча–2010 у колькасці блізу 40 тысяч чалавек — гэта стыхійны ўсплёск сацыяльнай энергіі пратэсту. Яна выявіла, што рэпрэсіямі і прапагандай не ўдалося нейтралізаваць ні грамадскія арганізацыі, ні незалежныя СМІ, што слой адданых прыхільнікаў рэжыму вельмі вузкі, што сацыяльны пакет — замалы, а рэсурс вычарпаны, што маўклівая большасць пераўтварылася ў маўклівую меншасць, што прапаганда струхлела, а рэпрэсіі ў параўнальна мяккім фармаце ўстойлівага эфекту не далі.

Адсюль інстынктыўны разварот да эскалацыі рэпрэсій з пашырэннем маштабу і ўзмацненнем жорсткасці. Адчайная спроба рэжыму вярнуць найперш баланс страху і, праз прапаганду, даверу да сябе, дакладней, веры, хаця б і безнадзейнай, у сваю моц і непахіснасць.

Плошча–2010 — гэта народ, а не насельніцтва. Асобы, а не статысты. Ахвяры, прызначаныя рэжымам на закланне ў ролі злачынцаў, паводзілі сябе не так, як разлічвалі арганізатары судзілішчаў. У турэмных камерах КГБ, падчас судоў і ў калоніях большасць з палітвязняў выявілі сябе мужнымі і нязломнымі, з пачуццём уласнай годнасці. Пад ціскам і катаваннямі не зламаліся, ні на каго, у тым ліку і на сябе саміх, не ўзвялі паклёп, адмовіліся падпісаць прашэнне аб памілаванні.

Яны — твары плошчы. Такія прыгожыя і прыязныя, спакойныя і ўсхваляваныя, натхнёныя і ўдумлівыя, стрыманыя і ўсмешлівыя. Падаецца, што на кім бы ні спыніўся злавесны выбар рэжыму — вынік быў бы той жа.

Гэта яшчэ і паказнік узроўню маральнасці валанцёраў Плошчы, які не парушаецца нават пакаяльнымі заявамі і подпісамі аб супрацоўніцтве з КДБ некаторых з палітычных вязняў. Грамадства ўспрыняло гэтыя эпізоды як яскравы знак самавыкрыцця рэжыму, як вяртанне да метадаў НКУС 1937 года. І здрыганулася.

Як маральнасць адных і амаральнасць другіх успрыняло грамадства напад спецкаманды сілавых структур увечары 19 снежня на групу кандыдата ў прэзідэнты Уладзіміра Някляева, яго збіццё да беспрытомнасці, з наступным арыштам і выкраданнем са шпіталя. І як расправу А. Лукашэнкі над сваімі апанентамі — прысуды кандыдатам у прэзідэнты Мікалаю Статкевічу, Андрэю Саннікаву, Дзмітрыю Усу, Алесю Міхалевічу, Віталю Рымашэўскаму.

Гэтыя арышты і прысуды дэманструюць яшчэ адну жахлівую рысу таталітарных рэжымаў — захоп і гандаль закладнікамі.

Яшчэ і па сёння за калючым дротам знаходзяцца 14 чалавек, уключна з Міколам Статкевічам і Андрэем Саннікавым. Вялікі неспакой выклікае здароўе і жыццё лідара «Маладога фронту» Змітра Дашкевіча, які цярпіць катаванні і бесчалавечнае абыходжанне. Гэтак жа, як і лідара грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Змітра Бандарэнкі, які перанёс цяжкую аперацыю на хрыбце, ходзіць на мыліцах і рызыкуе выйсці з турмы інвалідам. Трэці год за кратамі пакутуе Мікалай Аўтуховіч, якога спрабавалі падвесці пад абвінавачванне ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта. Арышт старшыні праваабарончай арганізацыі «Вясна» Алеся Бяляцкага ёсць непасрэдны працяг Плошчы–2010.

Можна меркаваць, што рэжым А. Лукашэнкі выйграў гэты раўнд барацьбы. У тым сэнсе, што яму ўдалося пакуль што стрымаць нарастаючую хвалю пратэстаў і вярнуць узровень страху і апатыі ў грамадстве на ранейшую адзнаку. Але як надоўга? І ці не пірава гэта перамога?

Так, Мядзведзеў і Пуцін выдалі А. Лукашэнку карт-бланш падтрымкі ў выглядзе эканамічных прэферэнцый у абмен на падпісанне ўсяго пакета дакументаў па АДКБ, а потым і на стварэнне Еўразійскага саюза. Па сутнасці, у абмен на поўную васальную залежнасць. З дазволам, па трапнаму выказванню аднаго з расійскіх палітолагаў, праводзіць «лібералізацыю — дзе можна, а рэпрэсіі — дзе трэба». Але, падаецца, карт-бланш гэты не на бестэрміновае ўладаранне. Васала лягчэй замяніць, калі стане няўгодным. Адначасова разгромам Плошчы Лукашэнка цалкам абарваў усе магчымасці сваёй гульні на Захад.

Вынікі нядаўніх думскіх выбараў у РФ, азначаныя падзеннем рэйтынгу кіроўнай групоўкі і хваляй шматтысячных мітынгаў, могуць падштурхнуць пуцінскую Расію на паскоранае ўмацаванне сістэмы «кіруемай дэмакратыі» на ўзор беларускай, але могуць (што таксама не выключана) наадварот, прымусіць пачаць рэформы.

Разгром Плошы–2010 датуе сабой пачатак канца беларускай мадэлі палітычнай сістэмы. Якім бы ні быў гэты канец: ці тое па найгоршаму сцэнару — пераўтварэнне Беларусі ў абсалютна залежнага васала Расіі з захаваннем фармальнага суверэнітэту, ці па аптымістычнаму — дэмакратычных пераўтварэнняў з умацаваннем суверэнітэту і сваім дастойным месцам у еўрапейскай супольнасці.

Аргументаў на карысць аптымістычнага сцэнару дадае, нягледзячы на разгром, і Плошча–2010, пастаўленая ў кантэкст падзей гісторыі найноўшага часу. Дзяды–1988 можна лічыць пачатковай датай гэтага перыяду руху Беларусі да дэмакратыі і суверэнітэту. Менавіта з таго — таксама разгромленага — шэсця на Курапаты вырасла перамога абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Вынікі выбараў 1994 года, і асабліва так званы рэферэндум лістапада 1996 года, датуюць сабой пераход у наступ рэакцыйных сіл. Шматтысячныя «Маршы свабоды» ўвасабляюць масавы супраціў гэтаму наступу. Потым быў спад. Плошча–2006 — новы пад'ём. Зноў — спад. Плошча–2010 — новы ўсплёск.

Зараз — зноў спад? Вонкава — так. Але жыццё штодня дэманструе нам, а сацыялагічныя датчыкі фіксуюць, імклівае пашырэнне пратэстных настрояў, якія на пранізлівых вятрах усеагульнага крызісу, пад ударамі цунамі інфляцыі і росту цэн могуць у любы момант сарвацца з пасіўнай фазы ў актыўную. Палітычны барометр паказвае на вясну. Энергія Плошчы–2010 не знікла бясследна.

**Скарочаны варыянт прадмовы да фотаальбома «За правa на выбар: Партрэты асуджаных. Плошча–2010», які ў хуткім часе выйдзе з друку.**

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### РАДЫЕАКТЫЎНЫЯ ЖУРАВІНЫ З ВІЦЕБСКА

**На цэнтральным сельскагаспадарчым рынку Кішынёва ў продажы выяўлены радыеактыўныя журавіны.**

У Рэспубліку Малдова яны дастаўлены кантрабандным шляхам з Віцебскай і Бранскай абласцей, гаворыцца ў прэс-рэлізе.

Па дадзеных Нацыянальнага ветэрынарнага дыягнастычнага цэнтра, утрыманне радыенуклідаў у ягадах перавышае норму ў два–тры разы, паведамляе *timpul.md*. Кіраўнік кішынёўскай гарадской паліцыі Сільвіу Мушук дапускае, што журавіны маглі быць сабраныя ў Чарнобыльскай зоне.

Партыя небяспечных ягад вынятая з рынкаў малдаўскай сталіцы, паліцыя вядзе расследаванне.

**Паводле сайта «Народныя навіны Віцебска»**

### ГЕНПРАКУРОР СУПРАЦЬ ШАПІРЫ

**У мінулым нумары мы пісалі пра тое, як знятага генпракурорам галоўурача Лідскай лякарні старшыня Гродзенскага аблвыканкама аднавіў на працы. І вось новы віток падзей.**

Генпракуратура праінфармавала Адміністрацыю прэзідэнта пра непрымальныя ўмовы ў некаторых раённых лякарнях. Вынікі маніторынгу накіраваны ў Адміністрацыю прэзідэнта, паведамілі ў Генеральнай пракуратуры.

Выяўлены парушэнні, факты ігнаравання правоў пацыентаў у Лідскай цэнтральнай раённай лякарні, эксплуатацыі бальнічных палат з парушэннем санітарна-эпідэміялагічных нормаў. Усталяваны факты неабгрунтаванага незапаўнення палат з камфортнымі ўмовамі знаходжання пры перавышэнні нарматываў напаўняльнасці палат і размяшчэння хворых у калідорах. Па выніках маніторынгу старшыні Лідскага райвыканкама вынесена прадстаўленне пра ўхіленне парушэнняў заканадаўства пры аказанні стацыянарнай медыцынскай дапамогі. За дапушчаныя парушэнні па патрабаванні пракуратуры спынены працоўныя адносіны з галоўным урачом лякарні, да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнуты намеснік старшыні Лідскага райвыканкама і службовыя асобы лякарні.

Пакуль 2:1 на карысць Генпракуратуры.

**Паводле сайта «Блог Гродно s13»**

### ІДЗЕМ НА РЭКОРД

**Упершыню з моманту далучэння Польшчы да Шэнгенскай дамовы Генеральнае консульства Рэспублікі Польшча ў Брэсце выдала 100 тысяч віз на працягу года.**

«Пераадоленне мяжы ў 100 тысяч віз на працягу года з'яўляецца вялікай падзеяй для ўсяго консульства, а асабліва для візавага аддзела, — паведаміла генеральны консул РП у Брэсце Ганна Навакоўска. — Сёлета мы ўжо выдалі на 56% больш віз, чым у папярэднім годзе. Гэта нават больш, чым у 2009 і 2010 гадах разам узятых».

Грамадзяне Беларусі могуць атрымаць візу дзякуючы працы 4 консулаў і 15 супрацоўнікаў — грамадзян РБ візавага аддзела. Па словах Навакоўскай, яны робяць усё магчымае, а часам і немагчымае, каб дапамагчы ўсім ахвотнікам атрымаць візу. Хоць, як адзначае генконсул, здараецца, што немагчыма выдаць візу своечасова па віне саміх грамадзян, галоўным чынам з-за занадта позняй падачы дакументаў. Не ўсе ўлічваюць, што віза шэнген афармляецца 14 дзён з моманту аплаты, нацыянальная — 7 дзён.

«Звяртацца за візай можна ўжо за 3 месяца да меркаванай паездкі. Калі ў вас ёсць віза, выдадзеная мінімум на 6 месяцаў, вы таксама можаце звяртацца за чарговай за 3 месяца да яе заканчэння, не чакаючы канца тэрміна дзеяння папярэдняй», — нагадала Ганна Навакоўска.

Дарэчы, уладальнікам стотысячнай візы стаў вучань сярэдняй школы з Брэсцкага раёна, які выязджае на экскурсію ў Варшаву.

**Паводле «Брэсцкай газеты»**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ГАЛАДОЎКА ПРАТЭСТУ

**Інвалід другой групы Валер Ганчарэнка, хворы на адкрытую форму сухотаў, які не можа атрымаць годнага лекавання, 12 снежня абвясціў галадоўку ў Багушоўскім абласным сухотным шпіталі.**

Валер патрабуе паляпшэння ўмоваў лекавання хворых на сухоты.

«Я ўручыў афіцыйную заяву галоўурачу Наталлі Лясной, што з 12 снежня я пачынаю галадоўку і адмаўляюся ад прыёму ўсіх медыкаментаў», — паведаміў ён прэсавай службе Беларускай хрысціянскай дэмакратыі.

Нагадаем, што тыдзень таму Валер Ганчарэнка абвясціў аб сваёй гатоўнасці прынесці сябе ў ахвяру замест «бязвінна асуджаных віцебскіх тэрарыстаў». Па яго словах, ён не можа больш існаваць у такіх умовах.

**Паводле bchd.info**

З НАГОДЫ

## СУСТРЭЧА З ПРАКУРОРАМ

**16 снежня ў Генеральнай пракуратуры Польшчы адбудзецца сустрэча прадстаўнікоў беларускіх і міжнародных арганізацый з намеснікам генеральнага пракурора Польшчы Робертам Хернандэм.**

З боку арганізацый у сустрэчы прыме ўдзел прадстаўнік «Саюзу на карысць дэмакратыі ў Беларусі» Анатоль Міхнавец, прадстаўнік Цэнтра «Супрацоўніцтва без межаў» Ігар Шчэкарэвіч і праваабаронца Андрэй Жукавец.

На сустрэчы плануецца абмеркаваць шматлікія факты парушэння правоў актывістаў беларускай апазіцыі ў Польшчы. А менавіта рашэнне пракуратуры ў Быдгашчы пра забарону бел-чырвона-белага сцяга і шматгадовы пераслед беластоцкай пракуратурай Андрэя Жукаўца.

Таксама беларусаў цікавіць, чаму дагэтуль не былі адпаведна пакараныя супрацоўнікі Генпракуратуры Польшчы, адказныя за перадачу банкаўскіх звестак праваабаронцы Алеся Бяляцкага.

Ва ўсіх гэтых парушэннях, паводле прадстаўнікоў арганізацый, вінаватыя пракуратуры розных гарадоў Польшчы. Актывісты не выключаюць, што некаторыя такія рашэнні польскія пракуратуры прымалі ў супрацоўніцтве з беларускім рэжымам.

Сустрэцца з актывістамі Роберт Хернанд згадзіўся пасля супольнага ліста ў польскую Генпракуратуру ад Цэнтр «Супрацоўніцтва без межаў», «Саюза на карысць дэмакратыі ў Беларусі», «Маладога Фронту», «Беларускай хрысціянскай дэмакратыі» і «Еўрапейскай Беларусі». У сваім звароце арганізацыі прасілі аб сустрэчы з кіраўніцтвам Генпракуратуры Польшчы для абмеркавання шматлікіх фактаў парушэння правоў актывістаў беларускай апазіцыі ў Польшчы.

**Прэс-служба Цэнтра «Супрацоўніцтва без межаў»**

ЗАКЛІК

## «ВЯСНА» ПРОСІЦЬ ДАПАМОГІ!

**Вольга ХВОІН**

**Праваабарончыя арганізацыі Беларусі абвясцілі збор сродкаў для выплаты сумы, якую мусіць заплаціць Алесь Бяляцкі па пастанове суда.**

Згодна з рашэннем суда, Алесь Бяляцкі мусіць выплаціць 757 мільёнаў 526 тысяч 717 беларускіх рублёў (каля 90 тысяч долараў) за страты, нанесеныя дзяржаве ў выніку нявыплаты падаткаў з грошай, што былі пералічаныя на дзейнасць праваабарончага цэнтру.

«З мэтай хутчэйшага вызвалення Алеся Бяляцкага або як мінімум змены яму меры стрымання або змякчэння надзвычай жорсткага прысуду мы пачынаем кампанію па зборы сродкаў», — заявілі ў часе адмысловай прэсавай канферэнцыі праваабаронцы.

Намеснік старшыні ПЦ «Вясна» Валянцін Стэфановіч падкрэсліў, што гэты зварот да суайчыннікаў «ніякім чынам не з'яўляецца прызнаннем віны, згодай з прысудам, гэта спроба дапамагчы чалавеку, які апынуўся ў няпростай сітуацыі».

«Праваабарончы цэнтр «Вясна» заўжды прымаў усе магчымыя меры для выратавання палітвязняў. Як вы памятаеце, з дапамогай грамадзян мы пагасілі страты, што былі нанесеныя 19 снежня, — вытаптаныя некалькі кустоў ядлоўцу і адарваная труба. Мы гэтыя грошы выплацілі спляцідь, хаця наша пазіцыя і пазіцыя іншых міжнародных праваабарончых арганізацый, што ніякіх масавых беспарадкаў 19 снежня не было, — адзначыў Валянцін Стэфановіч. — Таму зараз мы лічым, што мусім скарыстаць усе магчымыя сродкі, каб выратаваць нашага калегу. Я не магу сказаць дакладна, што Мінскі гарадскі суд улічыць тое, што сплачаная шкода. Тым не менш, я асабіста і мае калегі будзем адчуваць, што зрабілі ўсё магчымае. Мы пятнаццаць гадоў дапамагалі ўсім, і цяпер просім дапамагчы Алесю».

Адмысловы рахунак адчынены на імя жонкі Алеся Наталлі Пінчук. Праваабаронцы не ведаюць пакуль даты разгляду касацыйнай скаргі. Але мяркуюць, што на збор сродкаў ёсць прыблізна два тыдні.

Філіял №529 «Белсвязь» ААТ «АСБ Беларусбанк», код банка 720, банкаўскага ўкладу: 01053568; від плацяжу: ахвяраванне (альбо добраахвотны плацеж). Атрымальнік плацяжу: Пінчук Наталля Сяргееўна.

Увага! Грошы могуць пералічваць толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

## ГРАМАДСТВА ПРОСІЦЬ НЕ ЗАБІВАЦЬ

**Генадзь КЕСНЕР**

**Колькасць падпісантаў пад размешчанай у інтэрнэце петыцыяй супраць смяротнага пакарання Дзмітрыя Канавалава і Уладзіслава Кавалёва перавысіла 60 тысяч чалавек.**

У беларускую амбасаду ў Польшчы перададзены звыш 500 подпісаў удзельнікаў канферэнцыі па правах чалавека. З заклікам памілаваць 25-гадовых хлопцаў да Лукашэнкі звярнулася Міжнародная федэрацыя правоў чалавека (FIDH).

Пяцьсот чатырнаццаць чалавек падпісаліся пад зваротам да кіраўніка Беларусі з просьбай аб памілаванні асуджаных. Як паведамляе Праваабарончы цэнтр «Вясна», подпісы збіралі валанцёры групы «Гарызонт — супраць смяротнага пакарання», Асацыяцыі «Адкрытая Рэч Паспаліта» (Otwarta Rzeczpospolita) і Хельсінкскага фонду па правах чалавека (ХФПЧ) на канферэнцыі «Правы чалавека — сучасны стан дыскусіі».

Зварот падпісалі дакладчыкі і ўдзельнікі канферэнцыі, а таксама асобы, якія непасрэдна не прымалі ўдзелу ў канферэнцыі. Пад зваротам падпісаліся, у прыватнасці, Роберт Бадынтэр (Парыж, Універсітэт Сарбона; экс-старшыня Канстытуцыйнага савета Рэспублікі Францыі, вядомы сваёй дзейнасцю ў галіне адмены смяротнай кары), Данута Пшывара (старшыня ХФПЧ), Паула Савіцкая (старшыня Асацыяцыі «Адкрытая Рэч Паспалітая», іншыя вядомыя праваабаронцы і выкладчыкі ўніверсітэтаў з многіх краін свету. Зварот быў высланы 12 снежня Аляксандру Лукашэнку праз амбасадара Беларусі ў Польшчы. Раней, 1 снежня, асацыяцыя «Адкрытая Рэч Паспалітая», а 6 снежня — ХФПЧ і «Гарызонт» адправілі асобныя звароты.

У сваю чаргу, рэзка асуджае смяротныя прысуды, вынесеныя Дзмітрыю Канавалаву і Уладзіславу Кавалёву, Міжнародная федэрацыя правоў чалавека. «Супярэчлівыя сведчанні падчас суда выклікалі сумневы ў датычнасці абвінавачаных да арганізацыі выбухаў, — адзначаецца ў заяве FIDH. — Больш таго, назіральнікі паведамлялі аб сур'ёзных працэсуальных парушэннях падчас папярэдняга следства і судовага разгляду справы, дастатковых для таго, каб канстатаваць грубае парушэнне правоў абвінавачаных на справядлівы і бесстаронні суд, ні матывы, ні дакладныя абставіны злачынства не былі высветленыя ў судзе».

«Мы не павінны мірыцца з ужываннем смяротнага пакарання ў цэнтры Еўропы», — заявіла прэзідэнт FIDH Сухэйр Белхасен. — Характар гэтага пакарання цалкам супярэчыць міжнародным стандартам».

Больш за 33 тысячы чалавек падпісаліся пад асабістай петыцыяй маці Уладзіслава Любові Кавалёвай, у якой жанчына просіць людзей дапамагчы захаваць жыццё яе сыну. Да таго ж, днямі больш за 165 тысяч подпісаў, сабраных «Міжнароднай амністыяй» пад заклікам спыніць у Беларусі смяротнае пакаранне, былі адпраўлены па пошце на адрас Адміністрацыі беларускага кіраўніка.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЯК ЗБЕГЧЫ З ТЭЛЕБАЧАННЯ

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Штосьці неверагоднае зараз адбываецца ў Белтэлерадыёкампаніі. Падаецца, што адтуль пачаўся масавы сыход. Прычым пасады пакідаюць амаль топавыя асобы, якіх мы ўжо прызвычаіліся бачыць на экранах Беларускага тэлебачання.**

13 снежня Лукашэнка разгледзеў кадравыя пытанні. У выніку сваю пасаду пакінуў Аляксандр Мартыненка, намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі. Ён не пісаў заявы на звальненне — яго папросту «сышлі».

Тэнгіз Думбадзэ сышоў з АНТ на іншую пасаду. З 5 снежня тэлевядучы ўзначальвае беларускі офіс «тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі саюзнай дзяржавы». На АНТ Тэнгіз працаваў з 2004 года. Аўтар, вядучы і кіраўнік творчай групы праграмы «Дыханне планеты». Пасля закрыцця праграмы «Выбар» з Сяргеем Дарафеевым стаў сувядучым ток-шоў «Адкрыты фармат».

А вось сам Дарафееў, якога «сыйшлі» за непрыемныя пытанні да Лідзіі Ярмошынай пасля прэзідэнцкіх выбараў, раптам стаўся вялізным дэмакратам. Дарафееў 14 снежня ўзяў удзел у дыскусіі «Як украінскія журналісты могуць дапамагчы Беларусі?». Гэтае мерапрыемства прайшло ў Кіеве, дзе Дарафееў зараз працуе, у межах кампаніі «Тыдзень салідарнасці з Беларуссю». Запланаваныя былі таксама круглы стол украінскіх пісьменнікаў «Літаратара супраць рэпрэсій у Беларусі». У дзень гадавіны Плошчы ў Кіеве адбудзецца пікетаванне пасольства Беларусі «Свабоду палітвязням».

А вось Лідзія Ярмошына, у адрозненне ад Дарафеева, засталася пры сваёй пасадзе.

Аляксандр Лукашэнка 13 снежня падпісаў указ № 574, якім прызначаны члены Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Як паведаміла прэс-служба прэзідэнта, імі сталі Васіль Бушчык, Лідзія Ярмошына, Вадзім Іпатаў, Мікалай Лазавік, Марына Рахманава і Алег Сліжэўскі.

Яшчэ адным указам, № 575, Лідзія Ярмошына прызначана старшынёй Цэнтрвыбаркама з наступным узгадненнем яе прызначэння з Саветам Рэспублікі.

Цэнтральная выбарчая камісія дзейнічае на пастаяннай аснове, тэрмін яе паўнамоцтваў складае 5 гадоў. Папярэдні склад ЦВК быў прызначаны ў пачатку 2007 года. Яна складаецца з 12 членаў, на прафесійнай аснове працуюць старшыня і сакратар камісіі. Склад Цэнтрвыбаркама фарміруюць прэзідэнт і Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу на парытэтнай аснове (па 6 членаў камісіі) з кандыдатур, рэкамендаваных прэзідыумамі абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і адпаведнымі выканаўчымі камітэтамі.

Так што адбылося тое, што нам і абяцалі. Ніякіх зменаў заканадаўства па выбарах, ніякіх зменаў у ЦВК, і ніякага новага падзелу выбарчых акругаў не будзе. Хутчэй за ўсё, склады мясцовых і тэрытарыяльных выбарчых камісій таксама змяняцца не будуць. Таму парламенцкія выбары, што вельмі верагодна, будуць падобныя на прэзідэнцкія. Ці на мінулыя парламенцкія выбары, калі ў «палатку» не патрапіў ніводны прадстаўнік апазіцыі.

**Адбылося тое, што нам і абяцалі. Ніякіх зменаў заканадаўства па выбарах, ніякіх зменаў у ЦВК, і ніякага новага падзелу выбарчых акругаў не будзе**

А вось хто з эфіру збягаць не збіраецца — дык гэта Аляксандр Лукашэнка. На тыдні ён даў інтэрв'ю галоўнаму рэдактару радыёстанцыі «Руская служба навін» Сяргею Дарэнку.

Адказваючы на пытанні, Лукашэнка заявіў, што не лічыць зблізненне Расіі з Беларуссю перадвыбарным ходам.

Паводле яго слоў, Беларусі, якая з'яўляецца калідорам паміж Расіяй і Захадам, важна захаваць сваю незалежнасць. «Задача любой улады, а ў Беларусі перш за ўсё, — знайсці такі калідор, па якім ты можаш прайсці, не зачапіўшы інтарэсаў іншых, і не прадаціся, не прадаць свой суверэнітэт», — заявіў Лукашэнка.

Аднак яшчэ да выхаду інтэрв'ю Сяргей Дарэнка выклаў частку гутаркі ў сваім твітэры: «Лукашэнка круты: сказаў, у еўрапейскіх лідараў няма яек, я запярэчыў: у Сарказі ёсць. Лукашэнка прысудзіў: і ў Сарказі няма!» — напісаў Дарэнка. «Лукашэнка класны. Я намякнуў, што ў яго з Беларуссю як з жонкай. Ён сказаў, што вельмі гэтага б жадаў», — дадаў Дарэнка.

І вельмі кепская навіна для ўсіх беларускіх чыноўнікаў. Мала таго, што ім забараняе выезд за мяжу Еўропа, так тут яшчэ свае ж пастараліся. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на пасяджэнні 14 снежня прынялі ў другім чытанні папраўкі ў закон «Аб дзяржаўнай службе».

Як паведаміў намеснік старшыні парламенцкай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Міхаіл Орда, законапраект пашырае пералік абмежаванняў для дзяржаўных служачых. У прыватнасці, ім забараняецца карыстацца льготамі і перавагамі, што даюцца замежнымі дзяржавамі ў сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі або нацыянальнай прыналежнасцю, а таксама атрымліваць дакументы, якія даюць такія льготы і перавагі.

Праектам закона замацоўваецца абавязак дзяржслужачых перадаваць гэтыя дакументы ў кадравую службу дзяржаўнага органа. Невыкананне гэтага патрабавання будзе з'яўляцца падставай для вызвалення дзяржслужачага ад пасады.

То бок, «карту паляка» ніхто з дзяржслужачых не атрымае, ці калі паспелі, трэба будзе адмовіцца.

Пэўна, шмат хто з чыноўнікаў пакрыўдзіўся на гэта і вырашыў сапсаваць усім навагоднія святы. Сёлета ўсе навагоднія святы — як Нараджэнне Хрыстова ў каталікоў і праваслаўных Каляды, так і Новы год — прыпадаюць на выхадныя. Адпаведна, буднія дні застануцца працоўнымі, і ўжо 2 студзеня краіна павінна выйсці на працу.

Пакуль Савет міністраў ніяк не змяніў працоўнага графіка. Шмат хто спадзяецца, што адзін з выхадных перанясуць на 2 студзеня. Інакш гэты панядзелак шмат каму будзе цяжкі. Адны праводзяць Новы год за сталом, іншыя ў гэты дзень адведваюць родных.

Так што навагодніх вакацыяў не будзе.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### ІГАР АЗАРОНАК

Былы камандуючы ВПС і войскамі СПА Ігар Азаронак асуджаны «за лабіраванне інтарэсаў расійскага прадпрыемства па пастаўцы пэўнага абсталявання», — паведаміў журналістам намеснік генеральнага пракурора Аляксей Стук. Паводле яго слоў, Азаронак атрымаў хабар.

Як паведамлялася раней, былы камандуючы ВПС і войскамі СПА Ігар Азаронак прысуджаны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда да 9 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у калоніі ўзмоцненага рэжыму і з канфіскацыяй усёй маёмасці. Ён прызнаны вінаватым па ч. 3 арт. 430 (атрыманне хабару ў асабліва буйным памеры) КК. Паводле прысуду, Азаронак прымаў матэрыяльныя каштоўнасці ў асабліва буйным памеры, выкарыстоўваючы сваё службовае становішча, за спрыяльнае рашэнне пэўных пытанняў. Акрамя пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі і канфіскацыі маёмасці былы камандуючы прысуджаны да пазбаўлення права займаць пасады, звязаныя з арганізацыйна-распарадчай і адміністрацыйна-гаспадарчай дзейнасцю тэрмінам на 5 гадоў. Акрамя таго, ён пазбаўлены звання генерал-маёра.

Другі фігурант справы — грамадзянін Расіі Андрэй Машкаўцан прызнаны вінаватым па ч. 5 і 6 арт. 16 (саўдзел у злачынстве) і па ч. 3 арт. 430 (падбухторванне і дапамога ў атрыманні хабару ў асабліва буйным памеры). Ён асуджаны да 6 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у калоніі ўзмоцненага рэжыму.

### ДАР'Я ДОМРАЧАВА



Беларуская біятланістка Дар'я Домрачава ў гонках Кубка свету ў гэтым сезоне ўжо выйграла дзве з пяці асабістых гонак, двойчы была пятай.

«Золата» ў гонцы пераследу на этапе Кубка свету ў аўстрыйскім Хохфільцэне Дар'я Домрачава заваявала, апярэдзіўшы сваіх бліжэйшых супернiц, — расіянку Вольгу Зайцаву і немку Магдалену Нойнер.

Дар'я стартавала пятай, з адставаннем у 25 секунд ад пераможцы спрынту Магдалены Нойнер. У часе гонкі Домрачава дапусціла два промахі, на першым і трэцім агнявых рубяжах, аднак дзякуючы высокай хуткасці на лыжні трымалася ў групе лідараў. У той жа час Нойнер і Зайцава прыйшлі да чацвёртага агнявога рубяжу без штрафных колаў. Аднак на апошняй стральбе немка прамахнулася двойчы, а расіянка зарабіла 1 штрафны круг. Домрачава зачыніла ўсе пяць мішэняў і пайшла да фінішу першай.

У мінулым сезоне беларуская біятланістка Дар'я Домрачава заваявала Малы крышталёвы глобус у мас-старце.

### БАРЫС ПЯТРОВІЧ



Новым старшынёй грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» стаў Барыс Пятровіч (Сачанка). Яго абранне адбылося на XVI з'ездзе СБП 10 снежня ў Мінску.

Выбары старшыні СБП праводзіліся на безальтэрнатыўнай аснове. Кандыдатуру Барыса Пятровіча вылучыла рада саюза. Паступалі таксама прапановы вылучыць на пасаду старшыні Лявона Баршчэўскага, Уладзімера Някляева і Міхася Скоблу, аднак усе трое ўзялі самаадвод.

Ранейшы старшыня СБП Алесь Пашкевіч знаходзіўся на гэтай пасадзе з 2002 года. Выступаючы перад дэлегатамі сённяшняга з'езда, ён назваў сваё дзевяцігадовае старшынства ў СБП «вялікай школай». Аднак, адпрацаваўшы ў якасці старшыні два тэрміны, Пашкевіч заявіў пра намер пакінуць пасаду, каб не парушаць статут саюза.

Новаабраны кіраўнік СБП Барыс Пятровіч (Барыс Пятровіч Сачанка) нарадзіўся 17 ліпеня 1959 года ў вёсцы Вялікі Бор Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці, жыве ў Мінску. У 1983 годзе скончыў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Працаваў у абласным і рэспубліканскім друку. Ад 1990 года — адказны сакратар штодзённіка «Літаратура і мастацтва». Ад 2009 года — галоўны рэдактар літаратурнага штотыднёвіка «Дзеяслоў». Сябра СБП ад 1993 года, аўтар некалькіх зборнікаў прозы, першы з якіх — «Ловы» — быў апублікаваны ў 1992 годзе.

Цяпер у краіне існуюць два пісьменніцкія саюза — лаяльны ўладам Саюз пісьменнікаў Беларусі (СПБ) і альтэрнатыўны Саюз беларускіх пісьменнікаў (СБП).

Сябрамі СБП з'яўляюцца больш за 400 чалавек. Саюз уваходзіць у склад Міжнароднага супольніцтва пісьменніцкіх саюзаў (правапераемнік СП СССР), з'яўляецца сябрам Еўрапейскага пісьменніцкага савета і Балтыйскай пісьменніцкай асацыяцыі.

▸ ГЕАПАЛІТЫКА

# БЕЛАРУСЬ ЗАЧЫНІЛА ДЗВЕРЫ ДЛЯ ЕС

Вольга ХВОІН

**Вярхоўны прадстаўнік Еўрасаюза па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан лічыць, што ЕС варта працягнуць ціск на ўлады Беларусі з-за рэпрэсій у краіне. Сярод аналітыкаў ёсць меркаванне, што гэты бой Еўрасаюз прайграў. І цяпер яму застаецца працаваць з нізамі, каб сяэрднестатыстычныя беларусы цвёрда заявілі, што хочуць жыць у Еўропе, а не ў Расіі.**




«Эканамічны крызіс, што працягваецца, не павінен выкарыстоўвацца як нагода тымі, хто хоча аслабіць падтрымку правоў чалавека», — заявіла Кэтрын Эштан на пасяджэнні Еўрапарламента ў Страсбургу. Вярхоўны прадстаўнік мяркуе, што ЕС назіраецца глабальны падыход да вырашэння праблем у сферы правоў чалавека. Яна адзначыла іх універсальнасць, падкрэсліўшы, што яны «не падлягаюць абмеркаванню».

Навуковы сябра даследчай праграмы ЕС па Усходнім добрасуседстве і Расіі, супрацоўніца Фінскага інстытута міжнародных стасункаў Анаіс Марын магчымасці палітычнага ціску, санкцый у дачыненні да Беларусі ацэньвае вельмі крытычна. Маўляў, цяпер Еўропа ўвогуле блізкая да таго, каб страціць Беларусь як суверэнную дзяржаву на мапе. «Мы вярнуліся да таго, з чаго пачыналі, — афіцыйны Мінск можа ігнараваць Брусэль, бо мае падтрымку Расіі. Еўрапейскі саюз стаў закладнікам палітыкі ізаляцыі, а беларускі рэжым вярнуўся да сваіх звычайных учынкаў», — заявіла палітолаг падчас канферэнцыі ў Варшаве «Беларусь і беларусы сярод суседзяў: гістарычныя стэрэатыпы і палітычныя канструкты».

«Беларусь зачыніла дзверы для Еўрасаюза. Чаму так адбываецца? Бо няма адзінай стратэгіі паводзінаў, і ЕС выдаткоўвае на адпаведныя праграмы для Беларусі замала грошай. У Брусэлі не хапае экспертаў і ведаў па Беларусі. Да таго ж, некаторыя сябры ЕС бароняць у Беларусі свой бізнэс, як, напрыклад, Літва, Германія, — лічыць Анаіс Марын. — Цяпер Беларусь не ў спісе прыярытэтных кірункаў працы для Еўрасаюза. У ЕС ёсць свае праблемы, як, напрыклад, валютны крызіс. А краіны, што будуць наступнымі старшынстваваць у Еўрасаюзе, ужо заявілі: беларускае пытанне для іх не будзе дамінантным».

Яна падкрэслівае, што еўрапейскія чыноўнікі мусяць кіравацца прагматычнымі вынікамі, а не абяцаннямі, звярнуць увагу на інвестыцыйную працу, «каб Расія не паглынула Беларусь», і ўрэшце распрацаваць адпаведную «дарожную карту» адносінаў.

Разам з тым кіраўнік няўрадавай арганізацыі Freedom House Давід Крэмер, выступаючы на канферэнцыі АБСЕ ў Вільні, заявіў, што Аляксандр Лукашэнка ўяўляе пагрозу для незалежнасці сваёй краіны, і таму неабходна пашыраць эканамічныя санкцыі ў дачыненні да Беларусі.

«Я мяркую, што для ЗША і ЕС вельмі важна рабіць дадатковыя крокі па прымяненню эканамічных санкцый. І рабіць гэта як мага хутчэй. Перад тым, як Лукашэнка прадасць краіну Расіі. Мы бачым, што для таго, каб застацца ва ўладзе А. Лукашэнка ахвяруе незалежнасцю краіны», — сцвярджае кіраўнік Freedom House.

Крэмер выказаў шкадаванне, што Расія вырашыла падтрымаць беларускі рэжым. «10 мільярдаў долараў на фіктыўную АЭС, мільярды долараў энергетычных субсідый, пазык. На жаль, гэта крок назад, бо, на маю думку, Аляксандр Лукашэнка з узнікненнем эканамічнага крызісу апынуўся на танюткім лёдзе, які сам і стварыў. На жаль, здаецца, лідары ў Маскве даюць яму дапамогу», — казаў Крэмер.

Паводле яго слоў, ціск і санкцыі — адзіны спосаб супрацоўніцтва, які зразумелы Лукашэнку.

Па словах Крэмера, Захад мусіць не забывацца і на «публічную дыпламатыю», бо ёсць верагоднасць, што Беларусь расчаруецца ў Захадзе, калі асабіста адчуе ўздзеянне эканамічных санкцый. «Рызыка ёсць заўсёды. Таму вельмі важна, каб палітыка санкцый суправаджалася яснай публічнай дыпламатыяй, якая б тлумачыла, што гэтыя санкцыі накіраваныя на рэжым. Мы ведаем, што наступствы могуць адчуць людзі Беларусі, але гэта не асноўнае ўздзеянне, на якое мы спадзяемся», — сказаў ён.

Працаўнікам санкцый з'яўляецца кіраўнік Руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч. «Я веру, што мы выйграем. А Беларусь вернецца туды, дзе была, — у еўрапейскую сям'ю, — аптымістычна распачаў сваю прамову ў Варшаве на згаданай канферэнцыі палітык. — Вязняў у турмах усё больш, ёсць татальная залежнасць ад Расіі. Але я мяркую, што з дыктарам заўжды можна размаўляць, і з Гітлерам так рабілі, бо размова ідзе пра народ. Ніхто не ставіў мэту зрабіць з Лукашэнкі дэмакрата, бо ён такім не будзе. Мэта была развярнуць краіну да Еўропы. І было трошкі менш рэпрэсій, бо была магчымасць дыялогу з Еўропай. Усё магло быць распісана па месяцах, нельга даваць грошы і чакаць. Я не прыхільнік выдаткоўвання грошай, бо яны пойдуць на ўзмацненне рэжыму. Але не будзе дыялогу — не будзе і Беларусі. Санкцыі кепскія не толькі тым, што не даюць выніку, але і таму, што ўпіхваюць нас у Расію. Да таго ж санкцыі ўплываюць на меркаванне народа», — зазначыў палітык.

Даследчык Валер Булгакаў, выказваючыся аб магчымай змене палітычнага рэжыму, сказаў, што не бачыць перадумоў для такога выніку. «Мой адказ, ці будзе зрынуты рэжым Лукашэнкі бліжэйшым часам, адмоўны. Беларусь не мае цэльнай нацыі, што здольная рэалізаваць свой выбар», — гаворыць Булгакаў.

За эканамічныя санкцыі для Беларусі выказаліся сваякі рэпрэсаваных па палітычных матывах асобаў. На думку сваякоў асуджаных па палітычных справах людзей, сур'ёзны эканамічны ціск здольны вызваліць нявінных людзей з турмаў.

Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька таксама выказваўся за ўвядзенне санкцый, але візавых. На яго думку, санкцыі ЕС мусяць быць скіраваныя супраць тых, хто парушыў заканадаўства. А гэта перадусім супрацоўнікі сілавых структур. «Калі частка ўраду прэтэндуе на тое, каб мець нейкую сваю думку і пазіцыю наконт сітуацыі ў эканоміцы, важна, каб гэта не выглядала так, што вось яны кажуць пра нейкія рынкавыя рэформы, а іх тут бах — і не пускаюць у Еўразвяз... Трэба, каб усё ж такі была логіка і зразумеласць у дзеяннях», — пракаментаваў лідар АГП варыянт магчымага пашырэння спісу неўязных у ЕС прозвішчамі прэм'ер-міністра Беларусі, яго намесніка.

Цяпер у спісе візавых санкцый 245 асобаў: чыноўнікі, суддзі, пракуроры і загадчыкі дзвюх калоніяў, дзе адбываюць пакаранне палітвязнёныя. Тыя, хто трапіў у спіс, не маюць магчымасці наведваць краіны Еўрасаюза і карыстацца са сваіх актываў у еўрапейскіх банках.

▸ КАМЕНТАР

# ЗАНАДТА ВЯЛІКАЯ, КАБ ПАХІСНУЦЦА

Вольга ХВОІН

**Пасля выбараў у Дзярждуму Расіі і пратэстных вулічных акцый супраць фальсіфікацый у Маскве з'явілася выслоўе: здзейснілася мара расіян жыць як у Беларусі. Наступная акцыя прызначаная на 24 снежня, і ўлады Масквы яе ўжо дазволілі. Ці астудзіцца цяперашні запал Расіі ў дачыненні да Беларусі на хвалі ўнутраных грамадскіх пратэстаў?**

Бунтарскі дзень 5 снежня завяршыўся прыняццем рэзалюцый з шэрагам патрабаванняў да ўлады. У тым ліку маніфестанты патрабавалі правесці новыя парламенцкія выбары і лібералізаваць закон аб партыях, каб у выбарах маглі ўзяць удзел нефармальныя арганізацыі. Выбары, пратэст, блакіроўка інтэрнэт-рэсурсаў — аналогій з беларускімі парадкамі дастаткова. Але расійскія ўлады не сталі паўтараць беларускі досвед адзін да аднаго. Пратэстныя акцыі, дзе колькасць людзей была невялікай, сапраўды разганялі. Але ў Маскве, як бачым, назіраецца разгул лібералізму. Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў нават напісаў на сваёй старонцы ў Facebook, што не згодны ні з лозунгамі, ні заявамі, якія прагучалі ў ходзе акцыі. «Тым не менш мною было дадзена даручэнне праверыць усе паведамленні з выбарчых участкаў, якія датычацца выканання заканадаўства аб выбарах», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Пра тое, як будзе разгарацца полымя народнага гневу ў Расіі, можна будзе меркаваць бліжэй да Раства — прынамсі акрэсліцца кірунак дзеянняў. Але цалкам магчыма, што пара незадаволенасці будзе ўмела выпушчаная без вялікіх страт для дуумвірату.

Калі ж разважаць пра рэакцыю ў «чырвоным доме» на Карла Маркса, то народныя выступленні супраць нешматлікіх хаўруснікаў Аляксандра Лукашэнкі наўрад ці дадаюць яму аптымізму. Тым больш свежая памяць пра ганебны сыход з кіраўнічых пасадаў усходніх правіцеляў-прыяцеляў. «Гэта новы і нечаканы этап для Расіі, тут жа падзеі пакуль толькі асэнсоўваюцца і аналізуюцца, — разважае палітычны аглядальнік Раман Якаўлеўскі. — З высновамі, як спроба зладзіць у Маскве Майдан паўплывае на ўзаемаадносіны паміж Беларуссю і Расіяй, я б не спяшаўся, бо на наступным тыдні ў Маскве будзе сустрэча на вышэйшым узроўні ў рамках шматбаковых інтэграцыйных аб'яднанняў (19 снежня адбудуцца пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета (Беларусь, Казахстан, Расія) і Міждзяржаўнага савета ЕўрАзЭС на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў. 20 снежня пройдуць сесія Савета калектыўнай бяспекі АДКБ і нефармальнае пасяджэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, прымеркаванае да 20-годдзя Садружнасці — рэд.). Напрыканцы снежня ўвогуле будзе шэраг знакавых сустрэчаў, па выніках якіх і можна будзе рабіць высновы».

Якаўлеўскі мяркуе, што расійскі прыклад натхніць беларусаў пакуль не можа, бо масіраваны пагром у снежні мінулага года і наступныя рэпрэсіі супраць іншадумцаў трывала загналі незадаволеных уладаю на кухні. «Для нас увогуле тое, што абудзіла расійскі народ, не новае — мы назіралі гэта ў Беларусі і раней. Але крамлёўскае кіраўніцтва не кіне займацца беларускімі справамі на тле ўласных праблем. Расіянам яшчэ трэба выканаць планы па заробку ў «Белтрансгазе» ды завяршыць іншыя справы. Расія вялікая настолькі, што не пахіснецца», — жартуе палітаглядальнік.

Ён раіць звярнуць увагу на інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі радыёстанцыі «Руская служба навін». Дзе, ацэньваючы апошні этап беларуска-расійскіх адносінаў, Лукашэнка выказаў меркаванне, што з расійскага боку гэта не з'яўляецца перадвыбарчым ходам. «Я не веру, што гэта перадвыбарчае, што прымусіла нас зблізіцца, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Я не хацеў бы, каб гэта была толькі перадвыбарчая прычына. Мне здаецца, што ў выніку гэтых сутыкненняў лоб у лоб з рускімі — вы памятаеце: малочныя войны, і газ нам закручваюць, і нафту перакрывалі, і гэтак далей — усё ж такі мы прыйшлі да разумення, што гэтая бойка нічога не дасць, трэба па-новаму будаваць адносіны». «У гэтых словах чытаецца няўпэўненасць беларускага лідара ў шчырасці расійскага кіраўніцтва, няўпэўненасці ў будучыні», — адзначае Якаўлеўскі.

АДУКАЦЫЯ

# З ТАКІМ БАГАЖОМ ДЫ Ў БАЛОНСКУЮ СІСТЭМУ

Вольга ХВОІН

**26–27 красавіка 2012 года на Саміце міністраў адукацыі сарака сямі краін, якія падпісалі Балонскую дэкларацыю, мусіць быць прынята рашэнне аб далучэнні Беларусі да Еўрапейскага прасторы вышэйшай адукацыі (ЕПВА). Аднак прадстаўнікі акадэмічных колаў мяркуюць, што Беларусь без скандалу да балонскай сістэмы не далучыцца.**

Для таго, каб увайсці ў Еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі, краіна, якая падае заяўку, павінна адпавядаць двум крытэрам: далучыцца да Еўрапейскай культурнай канвенцыі і ўзяць на сябе абавязацельствы імплементаваць у сваю сістэму адукацыі каштоўнасці, мэты і ключавыя прынцыпы палітыкі ЕПВА.

Беларусь яшчэ ў 1993 годзе ратыфікавала Еўрапейскую культурную канвенцыю. Міністэрства адукацыі Беларусі запэўнівае Балонскі сакратарыят і еўрапейскіх міністраў, што наша вышэйшая адукацыя цалкам гатова да фармальнага сяброўства ў ЕПВА, што, пачынаючы з 2002 года, у Беларусі паслядоўна ўкараняюцца прынцыпы Балонскай дэкларацыі.

«Уступленне Беларусі ў Балонскі працэс — з'ява супярэчлівая. З аднаго боку, мы мусім радавацца, што Беларусь хоча далучыцца да еўрапейскай прасторы адукацыі. З іншага — мы спадзяемся, што гэта будзе крокам да сапраўднага рэфармавання адукацыі. Але, калі ацэньваць дакументы, падрыхтаваныя Міністэрствам адукацыі, то ступень гатоўнасці нашай вышэйшай школы да інтэграцыі з еўрапейскай завышаная», — гаворыць былы прарэктар Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта Уладзімір Дунаеў.

Сярод праблемных месцаў Дунаеў называе абсалютна іншую скіраванасць беларускай адукацыйнай сістэмы, самаізаляцыю, адсутнасць акадэмічнай свабоды. «Няма рэальнага ўдзелу грамадскасці ў кіраванні, адсутнасць аўтаноміі вышэйшай школы, няма адказнасці рэктараў перад акадэмічнай супольнасцю. З адсутнасці аўтаноміі ВНУ і выцякае палітызацыя ўніверсітэтаў, бо іх кіраўніцтва не мае мінімальнай незалежнасці, каб супраціўляцца загадам звонку», — падкрэслівае Дунаеў.

## Грамадскі Балонскі камітэт

Прадстаўнікі экспертнай супольнасці і шэрагу грамадскіх арганізацый Беларусі прынялі рашэнне заснаваць грамадскі Балонскі камітэт, каб падрыхтаваць альтэрнатыўны даклад і распрацаваць «дарожную карту» інтэграцыі беларускай вышэйшай адукацыі ў Балонскі працэс.

«Аналіз гатоўнасці нашай вышэйшай школы да ўступлення ў Балонскі працэс паказаў, што мы сёння далей ад Еўропы, чым нават у 2004 годзе, калі быў перапынены працэс інтэрнацыяналізацыі нашай адукацыі. У 2004 годзе працэсу збліжэння з Еўропай быў супрацьпастаўлены працэс самаізаляцыі беларускай вышэйшай адукацыі і вяртання да савецкай мадэлі з яе доўгім адукацыйным цыклам, ідэалагічным кантролем зместу адукацыі і палітычнай інструменталізацыяй вышэйшай школы. Сваё заканадаўчае замацаванне гэтая палітыка знайшла ў Законе «Аб вышэйшай адукацыі», прынятым 11 ліпеня 2007 года, з тэксту якога былі выключаныя артыкулы аб акадэмічнай свабодзе і ўніверсітэцкай аўтаноміі. Кодэкс аб адукацыі, які ўступіў з сілу ў 2011 годзе, толькі працягвае гэтую лінію», — гаворыцца ў тэксце альтэрнатыўнага дакладу.

Эксперты таксама прыйшлі да высновы, што заяўленая Мінадукацыі двухузроўневая структура вышэйшай адукацыі не адпавядае прынцыпам, які ляжыць у аснове Балонскай архітэктуры трох цыклаў бакалаўр-магістр-доктар. Прынцыповыя разыходжанні ў канструяванні адукацыйных цыклаў абцяжарваюць гарманізацыю беларускай і еўрапейскай адукацыйных сістэм. З-за гэтага ўзнікаюць значныя цяжкасці ў сферы прызнання дыпломаў, акадэмічных ступеняў і кваліфікацый.

«Асноўныя патрабаванні балонскай сістэмы нельга разглядаць фармальна. Гэта сістэма бакалаўр-магістр-доктар, акадэмічная мабільнасць, прызнанне кваліфікацыі. Мы мяркуем, што трэба выконваць шэраг фундаментальных патрабаванняў. І вырашаць нашы праблемы мы будзем самі. Уключэнне ў еўрапейскія сістэмы не азначае, што нехта за нас будзе выконваць працу», — гаворыць былы эксперт аналітычнага аддзелу Міністэрства адукацыі, а цяпер эксперт Агенцтва гуманітарных тэхналогій Святланай Мацкевіч.

**Балонскі працэс паказаў, што мы сёння далей ад Еўропы, чым нават у 2004 годзе, калі быў перапынены працэс інтэрнацыяналізацыі нашай адукацыі**

Абмяркоўваючы сітуацыю ў вышэйшай адукацыі Беларусі, эксперты згадалі і пра «адукацыйнае ўцякацтва», і пра негалосную забарону на прафесію ва ўніверсітэцкім асяродку, і пра сістэму куратарства з боку органаў дзяржбяспекі. «З такім багажом сорамна ўваходзіць у балонскую сістэму, — адзначыла Святлана Мацкевіч.

## Ранкам грошы, вечарам крэслы

«Трэба ўлічваць, што беларускія ўлады не схільныя да кампрамісаў. Таму можна было б прапанаваць: давайце мы вам намецім нейкія мінімальныя рэформы, якія можна было б зрабіць за два гады. І на наступным саміце Балонскай прасторы завершыць фармальны працэс далучэння да яе Беларусі, — выказвае меркаванне Уладзімір Дунаеў. — Напрыклад, можна было б увесці выбарнасць рэктараў і іх справаздачнасць акадэмічным саветам. Адна з перашкодаў да ўступлення — палітычныя рэпрэсіі, якія робяць не ўлады, а рэктары. І ў выніку яны ж ёсць у спісе неўязных у Еўропу. Іх трэба прыбраць з гэтага спіса, для чаго можна арганізаваць нейкі маніторынг, паглядзець, як змяняецца сітуацыя».

«Далучыўшыся да Балонскага клубу, можна нічога не рабіць: паабяцаць, і нічога не рабіць. Беларускае Міністэрства адукацыі імкнецца рэалізаваць менавіта такую стратэгію», — гаворыць Дунаеў. У 2004 годзе Мінадукацыі зрабіла разварот да ізаляцыі сістэмы адукацыі. А цяпер чыноўнікі сцвярджаюць, што ўжо 9 гадоў «паслядоўна» ідуць да балонскай сістэмы.

## «Дарожная карта»

Грамадскі Балонскі камітэт падрыхтаваў план дзеянняў па ўключэнні Беларусі ў еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі. На першым этапе мусіць быць спынена адлічэнне ці іншыя формы пакарання студэнтаў за ўдзел у палітычных акцыях ці ў дзейнасці незалежных, у тым ліку незарэгістраваных, грамадскіх арганізацый, спыненне звальненняў, пагроз звальненняў ці іншых формаў ціску на выкладчыкаў, іншых супрацоўнікаў ВНУ за аналагічныя дзеянні. Вышэйшыя навучальныя ўстановы не павінны браць на сябе функцыі праваахоўных органаў і не павінны прымаць удзелу ў палітычных рэпрэсіях, якія б формы яны не прымалі.

На другім — чакаецца заканадаўчае замацаванне пераходу на еўрапейскія падыходы да архітэктуры вышэйшай адукацыі, прызнанне кваліфікацый, кантролю якасці, акадэмічнай мабільнасці. Замацаванне ў законе рэальнай інстытуцыянальнай аўтаноміі і гарантый акадэмічных свабодаў для акадэмічнага персаналу і студэнтаў. Стварэнне прававой асновы для сацыяльнага партнёрства ў вышэйшай адукацыі. Стварэнне незалежнага інстытута кантролю якасці ды інш.

На трэцім этапе мусіць быць завершана рэфармаванне сістэмы акадэмічных ступеняў і кваліфікацый у адпаведнасці з QF-EHEA; завершанае рэфармаванне сістэмы кантролю якасці ў адпаведнасці з ESG, прыведзеная ў адпаведнасць з нормамі ENIC / NARIC сістэма прызнання кваліфікацый, створаная нацыянальная сістэма падтрымкі акадэмічнай мабільнасці.

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# МАЛАДЫЯ СТАРЫЯ



**Аднойчы пабачыў у раёнцы аб'яву пра тое, што Смалявіцкі выканкам абвяшчае конкурс на замяшчэнне пасады першага сакратара раённага камітэта БРСМ. І вачам сваім не паверыў. Бо выканкам — гэта натуральная вертыкаль, а БРСМ — грамадская арганізацыя.**

Спачатку падумалася пра ідэалагічную дыверсію, потым пра недарэчнасць, зробленую не надта граматнымі работнікамі. Каб высветліць, патэлефанаваў у выканкам, і там шчыра здзівіліся майму здзіўленню. Маўляў, моладзевая палітыка — у нас справа дзяржаўная.

Аказваецца, новае ёсць простым паўтарэннем старога, толькі на больш цынічнай аснове. Прыкладам, раней крыніцы фінансавання камсамолу былі дэверсіфікаванымі паміж партыйнымі, дзяржаўнымі бюджэтамі ды фондамі прадпрыемстваў, а ў адносна рынкавых умовах адзіна надзейным каналам з'яўляецца дзяржаўны бюджэт.

Усё астатняе робіцца, як і раней. Прыкладам, чым ніжэй сацыяльна-эканамічныя здабыткі прадпрыемства, тым цяжэй стварыць на ім пярвічную арганізацыю. А стварыўшы, трэба кінуць надзею сабраць унёскі ці склікаць сход. Таму галоўнае — парадак у дакументацыі. Ва ўсе часы моладзь застаецца моладдзю. Ёй заўсёды нешта патрэбна ад старэйшых, і калі тыя вызначаюць парадак, згодна з якім гэта можна атрымаць, дзейнічае па прынцыпе, абы адчапіліся. Каму болей за ўсіх хочацца, той болей і шчыруе.

Здаецца, дарэмна сацыёлагі шукаюць тут нейкія трэнды, спрабуюць вызначыць дынаміку поглядаў і настрояў. Іншая справа, што мінулая дастаткова ўяўная рэальнасць стала амаль цалкам уяўнай. Сказалі хлопцам пра пераемнасць, яны і абвясцілі сябе пераемнікамі. І правялі 47-ы па ліку з'езд. Атрымоўваецца, што на першым у іх выступаў Ленін, а на апошнім — Лукашэнка.

Зрэшты, Лукашэнка выглядае нават больш разумным за Леніна, бо абяцае і раздае пернікі пад нескладаныя ды канкрэтныя справы. Зрабі гэта, атрымаеш тое. Цяпер і зараз. Маўляў, праз выбары вы мне далі ўладу, праз выбары маеце права яе забраць. А я маю права яе не аддаць.

Зразумела, зноў жа праз выбары. Але што ж гэта за права, якое не дае магчымасці ні абраць, ні памяняць?

З улікам сталага веку самога Лукашэнкі і яго асяроддзя, калі яно спраўдзіцца, Беларусь чакае звычайная герантакратыя. Старэйшыя людзі, якія добра памятаюць «брэжнеўскае палітбюро», добра ведаюць, чым усё скончыцца.

А што з моладдзю? Камсамол быў такім жа кадравым адстойнікам для былой уладнай эліты, якім зараз з'яўляецца БРСМ. Кажуць, што зараз арганізацыя мае 500 тысяч сяброў. Мусіць, меней, чым калісьці камсамольцаў, але ж зашмат з пункту гледжання перспектыў кожнага. Іх мае нешматлікая вярхушка актывістаў. А добрыя перспектывы, з улікам тэндэнцыі да ўсталявання герантакратыі, адзінкі. Для іх сяброўства ў БРСМ — акалічнасць цалкам фармальная, бо на самай справе яны залічаны да своеасаблівай эліты. Толькі крытэрыі адбору тут не такія, як у Лізе плюшчу, што аб'ядноўвае выпускнікоў 15 лепшых універсітэтаў і каледжаў ЗША. Тут дзейнічае амаль сямейны прынцып — ад каго нарадзіўся, таму і спатрэбіўся.

Мне падаецца, лепш за ўсё спецыфіку беларускага грамадства і стасункаў дзяржавы з ім на з'ездзе выказала студэнтка Акадэміі кіравання Алена Сарока. Па яе меркаванні, Беларусь з'яўляецца краінай, дзе грошы, добрую вопратку і модны тэлефон можна атрымаць, калі выйсці на плошчу ды «пахлопаць, пабіць шыбы». Ніколі не чуў, каб дзе яшчэ ствараліся такія спрыяльныя ўмовы для чалавека-спажыўца.

Адчуваеце, які магутны IQ у мілай Алены. Але мусіць жаданне быць больш блізкай да людзей, якія прымаюць рашэнні, і яго перавышае.

Як паведамляюць СМІ, з 2005 года з дзяржаўнага БРСМ атрымаў для мэтаў сваёй дзейнасці блізу 100 мільярдаў рублёў. Цяжка палічыць, колькі гэта будзе ў доларах, бо ў 2005 годзе ён каштаваў 1750 рублёў, а зараз у 5 разоў болей. Але гэта не мае асаблівага значэння. Грошай даецца столькі, колькі патрэбна, каб руку гаспадара адчувалі, але дарагімі глупствамі не займаліся. Гаворкі пра нейкіх там ідэйных барацьбітоў увогуле не ідзе. І гэта не залежыць ад бюджэту. Нават калі б ён нічога не даваў, то у БРСМ не паменела б ні ален сарок, ні ігараў ды шматлікіх іншых, каму хочацца «выйсці ў людзі». Не заўжды любымі сродкамі, але часцей за усё шмат чым паступіўшыся.

Гэта маладыя старыя. У большасці яны пачынаюць старэць яшчэ ў дзяцінстве. Дапамагаюць у гэтай справе бацькі, жадаючы шчасця сваім аленам ды ігарам, і школа, якая спрадвеку практыкуе маніпулятыўнае выхаванне.

На жаль, такіх старцаў многа. Але не бальшыня. Не яны вызначаюць моладзевыя прыярытэты, густы, думкі і паводзіны. Тут большая заслугі маюць розныя адміністрацыі і міліцыі. Як толькі моладзь адчуе, што за «хлопанне» не дадуць не толькі «моднага мабільніка», але і дубінай у плечы, усё зменіцца з дакладнасцю наадварот.

ГАСПАДАРЧАСЦЬ

# ЗАЧЫСТКА СПАДЧЫНЫ КРАШЭЎСКАГА

Яўген БЯЛАСІН

**Спадчына вальналюбца і самага пладавітага пісьменніка (больш за 600 раманаў і паэм) літаральна знішчаецца. І гэта напярэдадні яго 200-годдзя.**

Бульдозерам ужо зраўнавалі фамільны склеп Крашэўскіх каля маёнтка ў Доўгім. Дзве труны ды цэглу расцерушылі па полі.

Найперш турбуецца Мікалай Волчык, былы настаўнік гісторыі, які родам з Доўгага. Спадар Волчык адразу вядзе да поля за вёскай:

*— Вось тут быў той пагорак, падмуркі капліцы. Тут стаяла бяроза, а тут былі кусты бэзу. Усё зраўнавалі з зямлёй. Ляжаць толькі там-сям цэглы ды цынк ад трунаў. Я атрымаў сігнал ды адразу ў сельсавет, у Палацык (музей у Пружанах). Няхай бы хоць назад загарнулі, можа потым што аднавілі б. «А не, дык буду біць трывогу!» А мне кажуць: маўчы!*

Капліčка Крашэўскіх была драўляная, і яе даўно спалілі, кажа спадар Волчык. Але ў склепе пад ёй знаходзіліся парэшткі двух родзічаў Крашэўскага (сам Юзаф Ігнацый Крашэўскі перапахаваны са Швейцарыі ў Кракаве).

*— Крашэўскі спачуваў сялянам, што нават на тым свеце яны без зямлі, і радаваўся, што зможа сабе потым дазволіць такі камфорт як уладальнік асобнага склепа. Яму і ў страшным сне не снілася, што косткі яго родзічаў*



Мікалай Волчык каля падмуркаў сядзібы Крашэўскіх



Знішчаны шляхецкі засценак у Белавусаўшчыне

*парасцягаюць па полі,* — кажа паэт і пчаляр Мікола Папека.

*— Хто ж гэтую капліčку дабіў?* — пытаюся.

Аказваецца, мясцовае аграпрадпрыемства.

*— Каб вачэй якому іх начальніку не мазоліла гэтая купіна пры дарозе,* — кажа Мікалай Волчык. *— Вось і сёння нехта тут праедзе. Наводзяць «марафет», хоць палова дамоў ужо пустыя».*

І праўда, воддаль таўкуцца двое старэйшых мужчын і жанчына, адзін косіць траву збоку вуліцы, двое быццам нешта збіраюць і зносяць.

Ідзем да падмуркаў маёнтка Крашэўскіх цераз шашу-гравійку. Тры старыя сажалкі ўжо захраслі граззю і зараслі, затое на месцы, куды перад сядзібай пад'язджалі карэты, з'явіўся вадаём. Там-сям ляжыць смецце. Тут зрабілі пясчаны кар'ер для падсыпкі дарогі.

*— Як быццам ім другога месца не было,* — заўважае Мікалай Волчык. *— Вось камяні з падмуркаў. У нас іх амаль няма, дык пан за кожны сялянам плаціў, і асобна за работу, калі камень калолі.*

Ён згадвае, як хлопчыкам быў сведкам таго, што пагрузчык браў друз з парэшткаў дома, і яго вазілі на ферму, падсыпалі ў падлогу. Выходзіць, дом Крашэўскіх памёр двойчы — ферма зачыненая.

*— Тады медальён тут знайшлі Крашэўскай, апошняй уладальніцы сядзібы,* — распавядае Мікалай Волчык. *— Вялікі такі. Ён цяпер у абласным краязнаўчым музеі. А гаспадыня пасля сталінічыны хацела прыехаць глянуць, ды калі ўбедала, што ўсё пабурылі, сказала, што нагі яе тут не будзе. У вайну, калі чырвоныя адступілі, нейкі месяц дом стаяў без нагляду, і яго паплюндравалі марадзёры. Дык немцы, калі прыйшлі, выведалі, хто і што, завезлі ў Пружанскую турму, а праз месяц расстралялі.*

Аказваецца, два гады таму агучваліся планы аднавіць «белую хатку пад таполямі» як музей Крашэўскага. Пэўна, ужо не атрымаецца: юбілей праз паўгады.

Едзем у бок Купліна. Гэтай дарогай Крашэўскія ездзілі ў Пружаны да Швыкоўскага, з якім вадзілі сяброўства. У час паўстання Каліноўскага з яго просьбы нібыта перахоўвалі зброю, за што іх хацелі пазбавіць усяго, але не даказалі.

Мінаем свіран — сучаснік Крашэўскага. Сёлета нейкі трактарыст сцягнуў з яго дах, і рэдкасныя скляпенні будынка замоклі, пасыпаліся.

*— Вось бугор, зарослы дрэвамі — гэта таксама парэшткі капліцы, але фермер не дадумаўся іх крануць,* — паказвае на вострaў сярод поля Мікола Папека.

Далей стаіць 300-гадовая царква. Жаласны выгляд: даху няма, сцены трэснулі, унутры дрэвы. Тое самае і са званіцай, і з агароджай.

*— Першая мураваная вясковая царква на нашых землях»,* — кажа Волчык.

У той дзень у нас хапіла часу яшчэ, каб паглядзець на апошні драўляны шляхецкі будынак рэгіёну — сядзібу Швыкоўскага-малодшага ў Белавусаўшчыне. Тады яна яшчэ стаяла з павыдзіранымі шыбамі і дзвярыма. На сёння ўжо зруйнаваная мясцовым аграпрадпрыемствам, а цэглы з клеймамі «Парыж» і «Лондан» выкінулі на сметнік.

*— Памяняўся старшыня,* — тлумачыць паэт-пчаляр. *— Раней шы дбаў, у гэтага нешта сваё на розуме. Так шмат гутаркі пра турыстычныя аб'екты ды маршруты, але вось вартае падазрона планамерна вынішчаецца тут, каля новай аб'язной шашы вакол Белавежскай пушчы. А яна ж адмыслова прызначаная для турыстаў. Калі няма моцы аднаўляць, дык чаму яны знаходзяцца на знішчэнне. Пакінулі б, час пакажа.*

Я патэлефанаваў у аддзел культуры Пружанскага райвыканкама. На тым канцы дрота сталі пералічваць, што ганарыцца ёсць чым: асноўная сядзіба Швыкоўскіх (Палацык), музей і палац Сапегаў у Ружанах, а да юбілею збяруць кнігі Крашэўскага…

Ведаю. Ведаю нават, што ёсць рашэнне Міністэрства культуры паставіць у вёсцы Доўгае памятны знак. Але па-мойму знак ужо выйшаў. Знак бяды.

ЭКАЛОГІЯ

# МЫ ПАСЛЯ БУДЗЕМ ВАС СУДЗІЦЬ

Таццяна ШАПУЦЬКА

**Прадстаўнікі ўладаў не знайшлі, што адказаць на пытанні жыхароў наконт забудовы сталічнага Парка дружбы народаў.**



У мінскай школе №53, дзе праходзілі грамадскія слуханні, купку мясцовых жыхароў і журналістаў сустрэлі неадназначна: «Вы на сход? Вы будзеце сядзець у прэзідыуме? Не? Тады не распранайцеся, я не паваду ў гардэроб — наконт вас мне не давалі ўказанняў», — мітусілася супрацоўніца школы. У прэзідыуме з правам распранууцца ў гардэробе засядалі старшыня адміністрацыі Савецкага раёна Генадзь Пасевін, дэпутатка парламента Галіна Палянская ды Сяргей Казлоўскі, начальнік аддзела горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама. У залі сядзела іх група падтрымкі — гарадскія спецыялісты ў справе экалогіі, будаўніцтва, аховы здароўя. Мясцовых жыхароў было каля сарака чалавек.

«Вы б аб'явы павесілі хаця б. Болей бы людзей прыйшло — у нас жа 600 чалавек падпісаліся пад зваротам пра парк», — выказвалі незадаваленне мясцовыя жыхары.

На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні, узнятыя жыхарамі ў пісьмовым звароце да гарадскога кіраўніцтва — вядоўца слуханняў (Казлоўскі) зачытваў праблемнае пытанне, а спецыялісты тлумачылі, чаму гэта не праблема для будаўніцтва. Праўда, мясцовыя жыхары не збіраліся проста сядзець і слухаць.

Самыя бурныя спрэчкі разгарнуліся вакол простага пытання забудовы парка. Вялізны парк Дружбы народаў — ледзь не адзіны зялёны куточак у Савецкім раёне Мінска. Ён ствараўся як філіял Батанічнага сада НАН, таму мае багата рэдкіх відаў раслінаў і нават эксклюзіўны калачак багны. Гарадскія ўлады вырашылі забудаваць палову парка — паводле генплану, на гэтым месцы мусіць размяшчацца пасольскі гарадок, цэнтр расійскай навукі і суд Савецкага раёна.

Варта абмовіцца, што афіцыйна тэрыторыя патэнцыйнага будаўніцтва мае статус зоны грамадскага карыстання, а не парка. Але ж ці важна для мясцовых жыхароў, як называецца іх улюбёны зялёны куточак, частку якога займае шыкоўны фруктовы сад? «Гэта калектыўны эгаізм! — гучна выказаўся дзяржаўны эколаг. — Вунь у Кунцаўшчыне наогул парка няма, а вы маеце! І яшчэ незадаволеныя будаўніцтвам! Вас падпісалася ўсяго 600 чалавек, а будаўніцтва — справа агульнарэспубліканская».

«Будаўніцтва вядзецца ў нас пад вокнамі. Вось чые такія важныя амбасады збіраюцца тут будаваць?» — парыравалі жыхары.

«Францыя, Азербайджан, Казахстан і Лівія», — пачырванеў начальнік аддзела горадабудаўніцтва Сяргей Казлоўскі. Зала зарагатала. «Для гэтых амбасадаў можна пашукаць і іншыя месцы ў горадзе, дзе не спатрэбілася б руйнаваць парк. Цэнтр расійскай навукі перанясіце ў горад-спутнік Смалявічы. А суд можа размяшчацца і ў старым будынку ці на пустыры, як Дом правасуддзя», — пярэчылі жыхары.

«Суд — важны для грамадства аб'ект і мусіць знаходзіцца ў годным месцы. Суд — гэта сімвал дзяржавы», — павучалі чыноўнікі.

«Вы яшчэ турму як сімвал дзяржавы тут пабудуйце. Вось мы вашы імёны зараз запішам і пасля ў гэтым судзе будзем судзіць», — не здаваліся жыхары.

На пытанне, чаму генплан быў прыняты без удзелу жыхароў, чыноўнікі здзіўлена выкатвалі вочы — маўляў, мы ж з вамі сядзім зараз і гэта абмяркоўваем. Рэпліка пра тое, што будаўніцтва суда ўжо даўно пачалося, і частка фруктовага сада знішчаная (паводле дакументаў, ужо выразана каля 200 здаровых дрэваў) павісла ў залі без адказу.

Чыноўнікі прынеслі з сабой вынікі разнастайных экалагічных экспертызаў, паводле якіх забудова не толькі не пагоршыць экалагічны стан раёна, але і палепшыць! Маўляў, мы вам і каналізацыю зробім (зараз у парку яе няма), і адчысцім тэрыторыю ад гаражэй, і нават дрэўцы новыя пасадзім.

Адзін з мясцовых жыхароў зачытаў вынікі экалагічнай экспертызы 1996 года, паводле якой будаўніцтва на гэтай тэрыторыі прывядзе да забруджвання глебы, транспартных праблемаў, пагаршэння экалогіі і падвышэння колькасці захворванняў. «Чаму вынікі мінулай экспертызы супрацьлеглыя вынікам вашай экспертызы?» — рэзонна спытаўся ён.

Грамадскія слуханні цягнуліся чатыры гадзіны, амаль да 23 гадзін вечара. «Такім чынам, ваша пазіцыя нязломная? Вы патрабуеце спыніць будаўніцтва, адмяніць генплан і афіцыйна пераўтварыць гэтую тэрыторыю ў парк альбо ў тэрыторыю культурніцкага прызначэння, так?» — удакладніў чыноўнік. — «Так», — гучна адказала зала. — «Дык а вы што нам скажаце?»— спыталіся жыхары, якія намагаліся гэтай сустрэчы ажно 6 месяцаў. — «Мы — нічога. Мы дакладзем пра вашу і нашу пазіцыі кіраўніку Мінгарвыканкама і будзем чакаць рэакцыі».

На сустрэчы прысутнічаў вядомы ў трэцім сектары Сяргей Драздоўскі — старшыня «Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў». «Я тут як мясцовы жыхар, — пацвердзіў ён «НЧ». — Сустрэча была пабудавана неканструктыўна. Прыйсці і кінуць экспертаў даказваць, што будаўніцтва тэхнічна магчыма — ды канешне магчыма. Можна і піраміду Хеопса пабудаваць — не пытанне. Пытанне — навошта?»

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 19 снежня, панядзелак

### Беларусь 1

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.45** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**09.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05** Серыял «Шырокая рака».
**11.05** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**12.10** Камедыя «Прыезджыя» (ЗША).
**13.55** Публіцыстычная праграма «Ветэраны» цыклу «Час Саюза».
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Культурныя людзі.
**15.55** Да цешчы на бліны.
**16.30** Тэлефільм АТН «Гісторыя па крупінках» цыклу «Зямля беларуская».
**16.45** Прэм'ера. Крымінальная меладрама «Закладнікі кахання» (Расія). 1-я серыя.
**17.40** Серыял «Шырокая рака».
**18.45, 01.10** «Зона Х».
**19.30** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.40, 01.20** Дзень спорту.
**21.55** Камандзіроўка.
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**23.10** Клуб рэдактараў.
**00.15** Прэм'ера. Дакументальна-гістарычны серыял «…І Шапілаў, што далучыўся да іх» (Расія). 1-я серыя.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.15** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** Прэм'ера. «Юры Нікулін. Прызнанне ў каханні».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.10** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм.
**23.15** Прэм'ера. «Лёс на выбар».
**00.20** «След».
**01.05** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мiншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.10** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**10.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Вялікі горад».
**13.10** «Далёкія сваякі».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Мiншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Прэм'ера! Фільм «Выкрутасы». Расія.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».

### Беларусь 2

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Ясі і худзей.
**09.40** Навіны надвор'я.
**10.10** Жансавет.
**10.45** Кінаспробы.
**11.15** Бітва экстрасэнсаў.
**12.25** Серыял «Маргоша» (Расія).
**14.25** Серыял «Гарачы лёд».
**15.30** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**15.55** Пазакласная гадзіна.
**16.15** Нянудны глобус.
**16.40** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**17.20** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**17.55** Серыял «Гарачы лёд».
**18.55** Камедыйная меладрама «Пізанская вежа» (Расія).
**21.05** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.40** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**23.20** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**23.50** Авертайм.
**00.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**01.15** Серыял «Маргоша» (Расія).

### Россия

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**12.25** «Ранішняя пошта».
**13.00** «Мой срэбны шар».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Громавы».
**21.35** Прэм'ера. Тэлесерыял «Толькі ты».
**23.35** Прэм'ера. «Гарадок».
**00.35** Навіны - Беларусь.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Шаман».
**21.20** Дэтэктыўны серыял «Дзікі-2».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.30** «Школа зласлоўя». Ток-шоў.

### Eurosport

**10.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка праследу. Ансі (Францыя).
**11.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**12.30** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам. Спроба 1.
**13.30, 16.15, 18.00, 21.00** Live. Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). Шэфілд (Вялікабрытанія).
**15.30** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам. Спроба 2.
**17.30** Тэніс. «Матс поінт». Часопіс.
**20.00, 01.45** Футбол. Часопіс.
**22.45** Вось дык так!!!
**23.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**23.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**00.30** Live. Конны спорт. Лондан (Вялікабрытанія).
**01.30** «Алімпійская мара». Часопіс.
**02.45** Снукер. Турнір PTC (Players Tour Championship). Шэфілд (Вялікабрытанія).

### Белсат

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.40** Зона «Свабоды».
**08.10, 14.05** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 6 серыя.
**08.55** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.10, 18.05** Дак. гадзіна: «Эпоха Барадуліна», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**10.05** ПраСвет.
**10.30** «Таямніцы Ватыкану», дак. серыял.
**10.55** Эксперт.
**11.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**11.40, 16.30** «Дайсці да Плошчы», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**12.10** «Зажмурся», маст. фільм, 2003 г., Польшча.
**13.35** Зона «Свабоды».
**14.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**15.10** «Таямніцы Ватыкану», дак. серыял.
**15.35** ПраСвет.
**16.00** Эксперт.
**17.00** «Таямніца Сагалі», серыял: 10 серыя.
**17.25** Зона «Свабоды».
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.55** «Рэаліці-шоу: выбары», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**19.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння.
**20.30** «Выбар Саннікава», дак. фільм.
**21.00, 00.15** Аб'ектыў.
**21.35** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**22.00** «Даволі! Да Волі…», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**22.50** «Зажмурся», маст. фільм, 2003 г., Польшча.
**00.50** Гарачы каментар.

## 20 снежня, аўторак

### Беларусь 1

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.10** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Пры загадкавых абставінах» (Украіна).
**10.10** Серыял «Шырокая рака».
**11.05** Крымінальная меладрама «Закладнікі кахання» (Расія). 1-я серыя.
**12.10** Арэна.
**12.35** «Еўрафэст». Відэадзённік.
**12.45** Зброя.
**13.00** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША).
**13.55** «Толькі жанчына ведае». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Камандзіроўка.
**15.40** Нябачны фронт.
**15.50** Эпоха. Падзеі і людзі.
**16.35** Серыял «Шырокая рака».
**17.45** Крымінальная меладрама «Закладнікі кахання» (Расія). 2-я серыя.
**18.45, 00.30** Зона Х.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Пры загадкавых абставінах» (Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.40, 00.40** Дзень спорту.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША). Заключная серыя.
**23.15** Дак.-гістарычны серыял «…І Шапілаў, што далучыўся да іх» (Расія). 2-я серыя.

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** «Аляксей Булдакоў. Ну вы, блін, даеце!».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера АНТ. «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Уцёкі». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**23.15** «Маленькія гіганты вялікага кіно».
**00.20** «След».
**01.05** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10, 17.20** «Мiншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Выкрутасы». Расія, 2010 г.
**10.40** «Справа асаблівай важнасці».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Мяжа. Тайговы раман». Расія.
**16.10** «Далёкія сваякі».
**16.50** «Сталічны футбол».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! Фільм «Масква - не Масква». Расія, 2011 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Жанчыны ХХ стагоддзя».
**23.30** «Аўтапанарама».
**23.50** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял.
**00.50** «Дурні, дарогі, грошы».

### Беларусь 2

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**09.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**10.50** Авертайм.
**11.20** Школа рамонту.
**12.30** Серыял «Маргоша» (Расія).
**13.35** Серыял «Гарачы лёд».
**15.35** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**15.50** Пазакласная гадзіна.
**16.10** Нянудны глобус.
**16.35** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**17.15** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**17.55** Серыял «Гарачы лёд».
**18.55** Хакей. КХЛ. Прамая трансляцыя.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.35** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**23.20** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**23.55** Спорт-кадр.
**00.25** Серыял «Маргоша» (Расія).

### Россия

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Громавы».
**12.55** «Прамы эфір».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Громавы».
**21.35** Тэлесерыял «Толькі ты».
**23.35** Прэм'ера. «Мацней за смерць. Малітва».
**00.35** Навіны - Беларусь.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Шаман».
**21.25** Дэтэктыўны серыял «Дзікі-2».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Прэм'ера. Серыял «Фармат А4».

### Eurosport

**10.30** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**11.00, 22.30** Снукер. Турнір PTC. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**12.00** Вось дык так!!!
**13.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Турнір Вялікага шалома. Мужчыны. Нью-Йорк (ЗША). Фінал - 2011 г.
**14.00** Тэніс. «Матс поінт». Часопіс.
**14.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 137. Энгельберг (Швейцарыя).
**16.00** Хуткасны спуск па лёдзе на канька́х (Crashed ice). Сусветная серыя. Мюнхен (Германія).
**17.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам. Спроба 2.
**17.30** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам. Спроба 1.
**18.30, 21.30** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА.
**19.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка праследу. Ансі (Францыя).
**20.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам. Спроба 1.
**20.30** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам. Спроба 2.
**23.30** Бокс. Міжнародны паядынак. Германія.
**01.00** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**01.15** Спартовыя бальныя танцы. Чэмпіянат свету па лацінаамерыканскіх танцах. Масква (Расія).
**02.15** Спартовыя бальныя танцы. Кубак Крамля. Масква (Расія).
**03.15** Вось дык так!!!

### Белсат

**07.00** Аб'ектыў.
**07.35** Гарачы каментар.
**07.45** «Одры Гэпбэрн», біяграфічная меладрама, 1999 г., ЗША: 2 серыя.
**09.05** «Таямніца Сагалі», серыял: 10 серыя.
**09.30** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**09.50** Еўропа сёння.
**10.20** «Выбар Саннікава», дак. фільм.
**10.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**10.55** «Рэаліці-шоу: выбары», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**11.20** «Ранча», серыял: 14 серыя.
**12.15** «Таямніца Сагалі», серыял: 10 серыя.
**12.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.10** «Выбар Саннікава», дак. фільм.
**13.40** «Даволі! Да Волі…», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**14.30** «Рэаліці-шоу: выбары», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**15.00** «Одры Гэпбэрн», біяграфічная меладрама, 1999 г., ЗША: 2 серыя.
**16.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.35** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**17.00** «Тры шалёныя нулі», серыял: 13 серыя.
**17.25** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Арол», серыял: 21 серыя.
**19.00** Два на два (тэледыскусія).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.40** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 12 серыя.
**22.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**22.50** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**23.15** Аб'ектыў.
**23.40** Гарачы каментар.

## 21 СНЕЖНЯ, СЕРАДА

### 1 Беларусь

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.20** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Пры загадкавых абставінах» (Украіна).
**10.10** Серыял «Шырокая рака».
**11.05** Крымінальная меладрама «Закладнікі кахання» (Расія). 2-я серыя.
**12.10** Сфера інтэрасаў.
**12.35** Зброя.
**12.50** Драматычны серыял «Доктар Хаўс-6» (ЗША). Заключная серыя.
**13.50** «Толькі жанчына ведае». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Актуальнае інтэрв'ю.
**15.40** Эпоха. Падзеі і людзі.
**16.20** Серыял «Шырокая рака».
**17.25** Крымінальная меладрама «Закладнікі кахання» (Расія). 3-я серыя.
**18.20** «Генеральны штаб. Больш быць, чым здавацца». Хранікальна-дак. фільм.
**18.45, 00.40** Зона Х.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Пры загадкавых абставінах» (Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.40, 00.50** Дзень спорту.
**21.55** Нацыянальны тэлевізійны музычны праект «Еўрафэст». Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**23.25** Дак.-гістарычны серыял «…І Шапілаў, што далучыўся да іх» (Расія). 3-я серыя.

### АНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера АНТ. «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Цюдоры». Шматсер. фільм.
**23.15** Асяроддзе пасялення.
**00.20** «След».
**01.05** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Масква - не Масква». Расія.
**10.40** «Прагнасць».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Студэнты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял.
**15.35** «Дурні, дарогі, грошы».
**16.50** «Прыгоды дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Вайна прыгажунь». Францыя.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Мінск і мінчане».
**23.30** «Дабро пажаліцца».
**23.50** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял. Заключная серыя.
**00.45** «Дурні, дарогі, грошы».

### 2 Беларусь

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Спорт-кадр.
**09.35** Рэальны свет.
**10.35** Музычная камедыя «Крама Імперыя» (ЗША).
**12.20** Серыял «Маргоша» (Расія).
**14.25** Серыял «Гарачы лёд».
**15.25** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**15.50** Пазакласная гадзіна.
**16.10** Нянудны глобус.
**16.35** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**17.15** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**17.55** Серыял «Гарачы лёд».
**18.55** Музычная камедыя «Крама Імперыя» (ЗША).
**21.05** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** Спортлато 5 з 36.
**21.30** КЕНО.
**21.35** Беларуская часіна.
**22.40** Моладзевы серыял «Інтэрны».
**23.25** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**23.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Громавы».
**12.55** «Прамы эфір».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Громавы».
**21.35** Тэлесерыял «Толькі ты».
**23.35** Прэм'ера. Сведкі.
**00.35** Навіны - Беларусь.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35, 15.35, 18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Шаман».
**21.25** Дэтэктыўны серыял «Дзікі-2».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Прэм'ера. Серыял «Фармат А4».

### EUROSPORT

**10.30** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**10.45** «Алімпійская мара». Часопіс.
**11.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Агляд сезону.
**12.00** Вось дык так!!!
**13.00** Футбол. Часопіс.
**14.00, 17.30** Хуткасны спуск па лёдзе на каньках (Crashed ice). Сусветная серыя.
**15.00** Снукер. Турнір PTC. Шэфілд (Вялікабрытанія). Фінал.
**16.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам. Спроба 2.
**16.30** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам. Спроба 1.
**18.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу. Ансі (Францыя).
**19.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам. Спроба 1.
**19.30** Live. Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам. Спроба 2.
**20.30** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА.
**21.30** «Разам у Лондан». Алімпійскі часопіс.
**21.45** Лёгкая атлетыка. «Фотафініш». Часопіс.
**22.00** Абранае па серадах.
**22.10** Абранае па серадах. Госць тыдня.
**22.25** Пола. Адкрыты чэмпіянат Аргентыны. Буэнас-Айрэс (Аргентына).
**23.25** Конны спорт. Кубак свету FEI. Лондан (Вялікабрытанія).
**00.25** Навіны коннага спорту.
**00.30** Гольф. Жанчыны. Дубай (ААЭ).
**00.40** Гольф тур. Навіны гольфа.
**00.45** Ветразевы спорт.
**01.15** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**01.20** Абранае па серадах.
**01.30** «Цыркавое мастацтва». Часопіс.
**02.30** «Цыркавое мастацтва». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25, 19.40** Гарачы каментар.
**07.35, 12.20** «Арол», серыял: 21 серыя.
**08.30, 13.15** Два на два (тэледыскусія).
**08.55** «Тры шалёных нулі», серыял.
**09.25, 14.10** На колах.
**09.50, 14.40** Рэпартэр.
**10.15, 15.05, 19.10** Сальда.
**10.35, 15.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**10.45** Эксперт.
**11.15** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**11.30** «Ранча», серыял: 15 серыя.
**13.45** «Тры шалёных нулі», серыял.
**15.30** Эксперт.
**16.00** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**16.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.30** «Euromaxx».
**17.00** «Дзяўчына з мокрай галавою», серыял: 1 серыя.
**17.20** Невядомая Беларусь: «Уладзімір Караткевіч. Душа застанецца», дак. фільм.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Прыстань», дэтэктыўны серыял.
**18.45** Вагон.
**18.55** «Скрадзеная малітва», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар.
**20.45** «Апантаныя», дак. цыкл: 3 серыя.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Без рэтушы: «Стоп, ДАІ», рэпартаж.
**21.50** «Каралева Бона», тэлесерыял.
**22.50** Два на два (тэледыскусія).
**23.15** Аб'ектыў.
**23.40** Гарачы каментар.

## 22 СНЕЖНЯ, ЧАЦВЕР

### 1 Беларусь

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.55** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Пры загадкавых абставінах» (Украіна).
**10.05** Меладраматычны серыял «Шырокая рака» (Расія- Украіна).
**11.05** Крымінальная меладрама «Закладнікі кахання» (Расія). 3-я серыя.
**12.10** Зямельнае пытанне.
**12.35** «Усё як мае быць!» Забаўляльная праграма аб турызме.
**13.00** Дакументальны фільм «Зорнае жыццё» (Украіна).
**13.55** «Здароўе». Ток-шоў.
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Актуальнае інтэрв'ю.
**15.40** Зона камфорту.
**16.05** Эпоха. Падзеі і людзі.
**16.50** Меладраматычны серыял «Шырокая рака» (Расія- Украіна).
**17.50** Крымінальная меладрама «Закладнікі кахання» (Расія). 4-я серыя.
**18.45, 01.15** Зона Х.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Пры загадкавых абставінах» (Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.40, 01.25** Дзень спорту.
**21.55** Адмысловы рэпартаж АТН.
**22.10** «Еўрафэст». Дарогамі Еўрабачання». Канцэрт.
**23.55** Дакументальна-гістарычны серыял «…І Шапілаў, што далучыўся да іх» (Расія). 4-я серыя, заключная.

### АНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера АНТ. «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Цюдоры». Шматсерыйны фільм.
**23.15** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.50** «Зваротны адлік».
**00.20** «След».
**01.05** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** Фільм «Вайна прыгажунь». Францыя, 2008 г.
**10.40** «Зорныя гісторыі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Студэнты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава». Серыял. Заключная серыя.
**15.35** «Дурні, дарогі, грошы».
**16.50** «Пяць гісторый».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Мядзведжы пацалунак». Расія-Германія-Швецыя-Францыя-Італія-Іспанія, 2002 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Праўда».
**23.35** «Аўтапанарама».
**23.55** «Навальнічныя вароты». Серыял.
**00.50** «Дурні, дарогі, грошы».

### 2 Беларусь

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Кожны мае права быць розным.
**09.35** Страсці па культуры.
**10.20** Рэальны свет.
**10.55** Гісторыка-прыгодніцкі фільм «Шляхціч Завальня» («Беларусьфільм»).
**12.45** Серыял «Маргоша» (Расія).
**14.50** Серыял «Гарачы лёд».
**15.50** Пазакласная гадзіна.
**16.10** Нянудны глобус.
**16.35** Моладзевы серыял «Інтэрны» (Расія). Заключная серыя.
**17.20** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**17.55** Серыял «Гарачы лёд».
**18.55** Хакей. КХЛ. Прамая трансляцыя.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.40** Моладзевы серыял «Інтэрны» (Расія). Заключная серыя.
**23.20** Камедыйны серыял «Зайцаў+1».
**23.50** Час футболу.
**00.35** Серыял «Маргоша» (Расія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Громавы».
**12.55** «Прамы эфір».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Громавы».
**21.35** Тэлесерыял «Толькі ты».
**23.35** Прэм'ера. «Танна і злосна. «Мордачка» і іншыя..».
**00.35** Навіны - Беларусь.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Таямнічая Расія».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** «Судовы дэтэктыў».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Шаман».
**21.20** Дэтэктыўны серыял «Дзікі-2».
**23.15** «Сёння. Вынікі».
**23.40** Прэм'ера. Серыял «Фармат А4».

### EUROSPORT

**10.30, 17.45** Лёгкая атлетыка. «Фотафініш». Часопіс.
**10.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Паўднёвая Карэя). Лепшыя моманты.
**12.00, 16.00** «Разам у Лондан». Алімпійскі часопіс.
**12.15** Вось дык так!!!
**13.00** «Цыркавое мастацтва». Часопіс.
**14.00** Хуткасны спуск па лёдзе на каньках (Crashed ice). Сусветная серыя.
**15.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Турнір Вялікага шалома. Мужчыны. Нью-Йорк (ЗША). Фінал - 2011 г.
**16.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Тэгу (Паўднёвая Карэя). Лепшыя моманты.
**18.00** Хуткасны спуск па лёдзе на каньках (Crashed ice). Сусветная серыя (Расія).
**19.00, 20.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА.
**21.00** Вось дык так!!!
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**01.00** Покер. Лондан (Вялікабрытанія).
**02.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**02.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Каралева Бона», тэлесерыял: 7 серыя.
**08.30** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 12 серыя.
**09.15** «Дзяўчына з мокрай галавою», серыял: 1 серыя.
**09.45** Праект «Будучыня».
**10.15** Навігатар.
**10.30** «Скрадзеная малітва», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**10.50** Два на два (тэледыскусія).
**11.15** Без рэтушы: «Стоп, ДАІ», рэпартаж, 2011 г., Польшча.
**11.40** «Апантаныя», дак. цыкл: 3 серыя.
**11.50** «Каралева Бона», тэлесерыял: 7 серыя.
**12.50** «Прыстань», дэтэктыўны серыял: 12 серыя.
**13.35** «Дзяўчына з мокрай галавою», серыял: 1 серыя.
**14.00** Праект «Будучыня».
**14.30** Навігатар.
**14.45** «Скрадзеная малітва», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**15.05** Два на два (тэледыскусія).
**15.30** Без рэтушы: «Стоп, ДАІ», рэпартаж, 2011 г., Польшча.
**15.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.10** «Апантаныя», дак. цыкл: 3 серыя.
**16.20** Невядомая Беларусь: «Уладзімір Караткевіч. Душа застанецца», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**17.00** «Зорны пірат», тэлесерыял: 4 серыя.
**17.25** Вагон.
**17.30** Басанож па свеце.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Перавозчык прыязных твараў», дак. фільм, 1993 г., Польшча.
**18.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**18.40** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 6 серыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Euromaxx».
**20.25** Эксперт.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр.
**21.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Бэркат і Маршо. Свабода і шчасце», дак. фільм, 2007 г., Чэхія.
**22.50** «Навенькая», дэтэктыўны серыял.
**23.35** Аб'ектыў.
**00.00** Гарачы каментар.

## 23 СНЕЖНЯ, ПЯТНІЦА

### 1 БЕЛАРУСЬ

**06.00, 07.05, 07.35, 08.10, 08.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Пры загадкавых абставінах» (Украіна).
**10.05** Меладраматычны серыял «Шырокая рака» (Расія- Украіна).
**11.05** Крымінальная меладрама «Закладнікі кахання» (Расія). 4-я серыя.
**12.10** Сфера інтэрасаў.
**12.35** Зброя.
**12.45** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».
**14.30** Тэлефільм АТН «Урокі бізнэсу».
**15.10, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Адмысловы рэпартаж АТН.
**15.40** Фартыфікацыя.
**16.20** Эпоха. Падзеі і людзі.
**17.05** Меладраматычны серыял «Шырокая рака» (Расія- Украіна).
**18.05** Крымінальная меладрама «Закладнікі кахання» (Расія). 5-я серыя.
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Пры загадкавых абставінах» (Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.40, 02.10** Дзень спорту.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** «Еўрафэст». Канцэрт.
**00.15** Трылер «Гульні патрыётаў» (ЗША).

### ОНТ

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Бедная Насця». Шматсер. фільм.
**12.00** «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.15** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Фінал.
**23.55** «Наша Белараша».
**00.30** Камедыя «На цвярозую галаву».
**02.25** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Мядзведжы пацалунак». Расія-Германія-Швецыя-Францыя-Італія-Іспанія, 2002 г.
**10.40** «Ашуканцы».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Студэнты». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Навальнічныя вароты». Серыял.
**15.35** «Дурні, дарогі, грошы».
**16.50** «Добры дзень, доктар».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Прышэльцы». Францыя, 1993 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Еўрапейскія покерныя турніры».
**00.20** Фільм «Мой захад». Італія, 1998 г.

### 2 БЕЛАРУСЬ

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Час футболу.
**09.45** Ясі і худзей.
**10.20** Школа рамонту.
**11.25** Цела чалавека.
**12.05** Страсці па культуры.
**12.50** Серыял «Маргоша» (Расія).
**14.50** Серыял «Гарачы лёд».
**15.50** Мультсерыял «Гара самацветаў».
**16.05** Пазакласная гадзіна.
**16.25** Нянудны глобус.
**16.50** Бітва экстрасэнсаў.
**17.55** Серыял «Гарачы лёд».
**18.55** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Прамая трансляцыя.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Бітва экстрасэнсаў.
**22.35** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**23.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**00.20** Містычны трылер «Небяспечная прырода» (Аўстралія).
**01.45** Серыял «Маргоша» (Расія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут лётасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Громавы».
**12.55** «Прамы эфір».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.45** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. «Юрмала - 2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.25** Фільм «Я шчаслівая!». 2010 г.
**00.20** Навіны - Беларусь.

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Вочная стаўка».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Фільм «Адстаўнік-3».
**21.25** Прэм'ера. «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**23.10** Прэм'ера. Фільм «Рэпартаж лёсу».
**00.55** Трылер «Кантракт».

### EUROSPORT

**10.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат ЗША. Турнір Вялікага шалома. Мужчыны. Нью-Йорк (ЗША). Фінал - 2011 г.
**12.00** Вось дык так!!!
**13.00** «Цыркавое мастацтва». Часопіс.
**14.00** Хуткасны спуск па лёдзе на каньках (Crashed ice). Сусветная серыя (Расія).
**15.00** Live. Горныя лыжы. Паказальны турнір. Слалам. Італія.
**16.30** Фігурнае катанне. Паказальны выступ. Opera on Ice.
**18.00** Хуткасны спуск па лёдзе на каньках (Crashed ice). Сусветная серыя (Канада).
**19.00, 20.00** Футбол. Класіка лігі чэмпіёнаў УЕФА.
**21.00** Вось дык так!!!
**22.00** Гонкі на колавых трактарах. Чэмпіянат Еўропы. Фінляндыя.
**22.30** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў.
**23.30** Боўлінг. PBA тур. ЗША. Агляд.
**00.30** Вось дык так!!!
**00.45** Аўтаспорт. Акадэмія GT. Часопіс.
**01.00** Покер. Партуш покер тур. Каны (Францыя).
**03.00** Гонкі на колавых трактарах. Чэмпіянат Еўропы. Фінляндыя.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** Басанож па свеце.
**08.00** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 6 серыя.
**08.45** Рэпартэр.
**09.10** «Зорны пірат», тэлесерыял: 4 серыя.
**09.40** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.05** «Пераворнік пр’ызных тварaў», дак. фільм, 1993 г., Польшча.
**10.30** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Бэркат і Маршо. Свабода і шчасце», дак. фільм, 2007 г., Чэхія.
**11.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**12.00** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**12.25** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 13 серыя.
**13.10** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.40** «Зорны пірат», тэлесерыял: 4 серыя.
**14.05** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 6 серыя.
**14.50** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**15.20** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Бэркат і Маршо. Свабода і шчасце», дак. фільм, 2007 г., Чэхія.
**16.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**16.35** «Перавознік прыязных твараў», дак. фільм, 1993 г., Польшча.
**17.00** «Букаландыя», мультсерыял для дзяцей: 3 серыя.
**17.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**17.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 13 серыя.
**18.50** «Апантаныя», дак. цыкл: 3 серыя.
**19.00** Без рэтушы: «Стоп, ДАІ», рэпартаж, 2011 г., Польшча.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Невядомая Беларусь: «Мінск. Горад пад чужым сонцам», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** «Жоўты шалік», маст. фільм, 2000 г., Польшча.
**22.50** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**22.55** Аб'ектыў.
**23.20** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

## 24 СНЕЖНЯ, СУБОТА

### 1 БЕЛАРУСЬ

**06.35** Існасць.
**07.00** Добрай раніцы, Беларусь!
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Ранішняя хваля.
**09.45** Скрынка перадач.
**10.20** Культурныя людзі.
**10.55** Прэм'ера. «Сваты. Жыццё без грыму». Дакументальны цыкл (Украіна).
**12.10** Камедыя «Дыяментавая рука» (СССР).
**14.05** Мультфільм.
**14.15** Вакол планеты.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.55** Меладрама «Лісты да Джульеты» (ЗША).
**18.00** Ваша лато.
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.15** Рамантычная меладрама «Мая мама - Снягурка» (Расія-Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.45** Святочная Калядная Імша. Прамая трансляцыя.
**23.50** Калядная служба з Ватыкана. Прамая трансляцыя.
**00.50** Камедыя «Калядныя прыгоды Кэрала» (ЗША).
**02.20** Дзень спорту.

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Разумніцы і разумнікі».
**12.00** Фільм «Блаславіце жанчыну».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Пра Фядота - стральца, заліхвацкага малайца».
**17.20** «Адмысловае заданне».
**18.40** «Адзін супраць усіх».
**19.25** Прэм'ера АНТ: «Фактар смеху».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Балеро». Фінал.
**22.45** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.25** «Што? Дзе? Калі?». Фінал года.
**00.40** Музычны фільм «Кажан».

### СТВ

**07.10** «Салдаты. Дзембельскі альбом». Серыял.
**09.00** «Чыстая праца».
**09.45** «Мінск і мінчане».
**10.20** Фільм «Прышэльцы». Францыя, 1993 г.
**12.20** «Прыгоды дылетанта».
**12.55** Фільм «Службовы раман». СССР, 1977 г. 2 серыі.
**16.00** «Жанчыны XX стагоддзя».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** Фільм «Снягурка для дарослага сына». Расія, 2007 г. 2 серыі.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Нацыянальная музычная прэмія ў вобласці эстраднага мастацтва».
**23.30** «Покер дуэль».
**00.20** Фільм «Маляня і Богіс». ЗША, 1996 г.

### 2 БЕЛАРУСЬ

**07.15** Каханыя камедыі. «Формула кахання» (СССР).
**08.55** Дабравест.
**09.20** Мір вашай хаце.
**09.30** Пра мастацтва.
**10.00** Школа рамонту.
**11.05** Ясі і худзей.
**11.45** Жансавет.
**12.25** Тэлебарометр.
**12.30** Інтуіцыя.
**13.40** Сямейная камедыя «Усё, што я хачу на Каляды» (ЗША).
**15.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**16.55** Хакей. КХЛ. Прамая трансляцыя.
**19.15** Каханыя камедыі. «Формула кахання» (СССР).
**21.00** КЕНО.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Бітва экстрасэнсаў.
**22.20** Камедыйная меладрама «Са святамі нішто не параўнаецца» (ЗША).
**00.15** Інтуіцыя.
**01.10** Эксцэнтрычная камедыя «Дзіўныя Каляды» (Украіна).

### РОССИЯ

**07.00** Фільм «Я шчаслівая!». 2010 г.
**08.35** «Юрмала - 2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Суботнік».
**11.50** «Відавочнае-неверагоднае».
**12.20** Дэтэктыўны «Знайсці і абясшкодзіць».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.40** Фільм «Два капітаны».
**17.35** Прэм'ера. «Новая хваля - 2011». Лепшае.
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40** Прэм'ера. Фільм «Мядовае каханне». 2011 г.
**00.05** «Гісторыя кахання». Канцэрт.

### НТВ

**07.10** Серыял «Марскія д'яблы».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Акадэмія прыгажосці».
**08.55** «Гатуем».
**09.30** «Выратавальнікі».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** Серыял «Дарожны патруль-4».
**15.10** «Жаночы погляд».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Таямнічая Расія».
**17.15** «Вочная стаўка».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.05** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.05** «Ты не паверыш!».
**23.00** «Апошняе слова». Вострасюжэтнае ток-шоў.
**00.00** Прэм'ера. Фільм «Другое каханне».

### EUROSPORT

**10.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Йорк (Вялікабрытанія). Фінал.
**12.00** Вось дык так!!!
**13.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Тэгу (Паўднёвая Карэя). Лепшыя моманты.
**14.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142. Камандныя спаборніцтвы. Куусама (Фінляндыя).
**15.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142. Куусама (Фінляндыя).
**16.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Спрынт.
**17.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт.
**18.00** «Цыркавое мастацтва». Часопіс.
**19.00, 20.00** Футбол. Класіка лігі чэмпіёнаў УЕФА.
**21.00, 22.00, 23.00, 00.00, 01.00, 02.00, 03.00** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Новенькая», дэтэктыўны серыял: 13 серыя.
**08.20** «Букаландыя», мультсерыял для дзяцей: 3 серыя.
**08.45** Калыханка для самых маленькіх.
**09.10, 13.00** Невядомая Беларусь: «Мінск. Горад пад чужым сонцам», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**09.40** Еўропа сёння.
**10.10** ПраСвет.
**10.35** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**11.00** Без рэтушы: «Стоп, ДАІ», рэпартаж, 2011 г., Польшча.
**11.25** «Апантаныя», дак. цыкл: 3 серыя.
**11.35** МакраФон: «Белая яблыня грому», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 1.
**12.10** «Букаландыя», мультсерыял для дзяцей: 3 серыя.
**12.35** Калыханка для самых маленькіх.
**13.30** Еўропа сёння.
**14.00** ПраСвет.
**14.25** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**14.50** Без рэтушы: «Стоп, ДАІ», рэпартаж, 2011 г., Польшча.
**15.15** «Апантаныя», дак. цыкл: 3 серыя.
**15.25** «Жоўты шалік», маст. фільм, 2000 г., Польшча.
**16.30** МакраФон: «Белая яблыня грому», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 1.
**17.00** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 11 серыя.
**17.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Рабінзоны Мантсінсаары», дак. фільм, 2008 г., Беларусь–Германія–Фінляндыя–Францыя.
**19.00** Зона «Свабоды».
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах.
**20.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.25** «Раства ў Сібіры», дак. фільм, 2006 г., Германія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.40** Суботні сеанс: «Дзяўчо з перлавай завушніцай», маст. фільм, 2004 г., Вялікабрытанія–Люксембург.
**23.15** «Каляды, Каляды», святочны канцэрт: ч. 1.
**23.45** Аб'ектыў.

## 25 снежня, нядзеля

**Беларусь 1**

**06.50** Камедыя «Калядныя прыгоды Кэрала» (ЗША).
**08.20** «Усё як мае быць!» Забаўляльная праграма аб турызме.
**08.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.10** Арсенал.
**09.40** Медычныя таямніцы.
**10.15** Да цешчы на бліны.
**10.55** Прэм'ера. «Сваты. Жыццё без грыму». Дакументальны цыкл (Украіна).
**12.10** Камедыя «Іван Васільевіч змяняе прафесію» (СССР).
**14.05** Мультфільм.
**14.15** Клуб рэдактараў.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Тэлефільм АТН «У госці да смалянчанкі» цыклу «Зямля беларуская».
**15.45** «Палёт над Айкуменай». Канцэрт.
**17.30** Хакей для ўсіх.
**18.20** Суперлато.
**19.05** Авантурная камедыя «Ідэальны муж» (ЗША-Вялікабрытанія).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** «Еўрафэст». Відэадзённік.
**22.10** «Еўрафэст». Канцэрт.
**00.00** Меладрама «Калядны катэдж» (ЗША).

**ОНТ**

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** Фазэнда.
**11.45** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**12.50** «Калядная гісторыя». Анімацыйны фільм.
**14.10** Фільм «Мы з джазу».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асыроддзе пасялення.
**17.20** Ералаш.
**17.40** Камедыя «Дзіця на пракат».
**19.25** Прэм'ера АНТ: «Фактар смеху».
**20.00** Контуры.
**21.05** Цырымонія ўручэння народнай прэміі «Залаты грамафон».
**00.30** Фільм «Сенсацыя».

**СТВ**

**07.00** Фільм «Граф Монтэ-Крыста». Францыя-Італія, 1953 г.
**10.10** «Аўтапанарама».
**10.40** «Вялікі сняданак».
**11.20** Фільм «Прышэльцы 2: калідоры часу». Францыя, 1997 г.
**13.30** «Добры дзень, доктар».
**14.00** Фільм «Звычайны цуд». СССР, 1978 г. 2 серыі.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.55** Фільм «Сардэчна запрашаем або суседзям уваход забаронены». ЗША, 2006 г.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Іронія лёсу, або з лёгкім парам». СССР, 1975 г., 2 серыі.
**00.05** Фільм «8 жанчын». Францыя - Італія, 2001 г.

**Беларусь 2**

**06.45** Музычная казка «Звычайны цуд» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**09.05** Прыступкі Веры.
**09.20** Размова са святаром.
**09.30** Гаспадар.
**10.05** Школа рамонту.
**11.15** Тэлебарометр.
**11.20** Ясі і худзей.
**11.55** Цела чалавека.
**12.35** Інтуіцыя.
**13.40** Эксцэнтрычная камедыя «Дзіўныя Каляды» (Украіна).
**15.35** Канцэрт фалькорнай групы «Купалінка».
**16.55** Трансляцыя з Ватыкана з удзелам Папы Рымскага Бенедыкта XVI.
**17.40** Кінаспробы.
**18.20** Музычная казка «Звычайны цуд» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Навіны надвор'я.
**21.45** Прэм'ера. Камедыйная меладрама «Больш, чым сябар» (ЗША).
**23.45** Інтуіцыя.
**00.35** 60-ы штогадовы міжнародны конкурс прыгажосці «Міс Сусвет-2011».

**РОССИЯ**

**07.00** «Пакой смеху».
**07.45** Фільм «Мядовае каханне». 2011 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «ХА». Маленькія камеды.
**12.15** Фільм «Прызначэнне».
**14.00** Весткі.
**14.15** «З новай хатай!».
**14.30** «Сакрэт яго маладосці. Карэл Гот».
**15.30** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**16.20** Фільм «Настаўнік спеваў».
**18.05** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера - 2011. «Стылягі-шоў». Гала-канцэрт.
**23.30** Паўфінал Першай лігі міжнароднага звяза КВЗ.

**НТВ**

**07.10** Вострасюжэтны серыял «Марскія д'яблы».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Увага: вышук!».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. «Калядная сустрэча НТБ».
**15.05** «ГРУ. Таямніцы ваеннай выведкі».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Следства вялі…».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**21.55** «Яна Рудкоўская і Яўген Плюшчанка. Наша споведзь».
**22.55** «Нтвшнікі».
**23.55** Вострасюжэтны дэтэктыў «Падводныя камяні».

**EUROSPORT**

**10.30** Фігурнае катанне. Паказальны выступ. Opera on Ice.
**12.00** Вось дык так!!!
**13.00** Хуткасны спуск па лёдзе на каньках (Crashed ice). Сусветная серыя (Канада).
**14.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 138. Лілехамер (Нарвегія).
**15.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 138. Лілехамер (Нарвегія).
**16.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Спрынт.
**16.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт.
**17.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142. Камандныя спаборніцтвы. Куусама (Фінляндыя).
**18.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 142. Куусама (Фінляндыя).
**19.00, 20.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА.
**21.00** Вось дык так!!!
**22.00** «Цыркавое мастацтва». Часопіс.
**23.00** «Цыркавое мастацтва». Часопіс.
**00.00** Бокс. Турнір Bigger's Better. Лісабон (Партугалія). Фінал.
**02.00** Фігурнае катанне. Паказальны выступ. Opera on Ice.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Зона «Свабоды».
**07.45** На колах.
**08.15** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 11 серыя.
**09.00** Калыханка для самых маленькіх.
**09.30** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**09.50** Два на два (тэледыскусія).
**10.15** МакраФон: «Каляды, Каляды», святочны канцэрт: ч. 1.
**10.45** Сальда (эканамічная праграма).
**11.00** «Рабінзоны Мантсінсаары», дак. фільм, 2008 г., Беларусь–Германія–Фінляндыя–Францыя.
**11.55** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**12.05** Вагон.
**12.15** На колах.
**12.40** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 11 серыя.
**13.30** Калыханка для самых маленькіх.
**14.00** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**14.20** МакраФон: «Каляды, Каляды», святочны канцэрт ч. 1.
**14.50** «Раство ў Сібіры», дак. фільм, 2006 г., Германія.
**15.20** «Дзяўчо з перлавай завушніцай», маст. фільм, 2004 г., Вялікабрытанія–Люксембург.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 7 серыя.
**18.00** Два на два (тэледыскусія).
**18.30** «Таўкачыкі на Каляды»: ч. 1.
**18.45** «Таямніцы Ватыкану», дакументальны серыял: 2 серыя.
**19.15** МакраФон: «Каляды, Каляды», святочны канцэрт: ч. 2.
**19.40** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Малыя здабыўцы», дак. фільм, 2009 г., Германія.
**20.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.40** Эксперт.
**22.15** Фільматэка майстроў: «Золата дэзерціраў», маст. фільм, 1998 г., Польшча.
**00.10** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.20** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**01.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8029) 178 31 68 Вольга;
Бабруйск: (8029) 628 75 01 Вольга;
Слуцк: (8044) 755 66 48 Марына.

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

З новага 2012 года мы вымушаны ўзняць падпісны кошт аднаго нумара газеты да 1200 руб., аднаго месяца — 4800 руб. Для тых, хто паспее падпісацца ў гэтым годзе, кошт застанецца ранейшым (750 руб. за нумар).

Запрашаем да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл.: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ________
Кассир Всего ________

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы час
www.novychas.org

КАМЕНТАР

# РАСІЯ. ДА І ПАСЛЯ БАЛОТНАЙ ПЛОШЧЫ

Алег НОВІКАЎ

**Мітынг 10 снежня на Балотнай плошчы, нягледзячы на знешнюю бяззубасць, можа стаць вяхой у сучаснай гісторыі Расіі. Прапануем агляд расійскай аналітыкі.**

Нагадаем, што акцыя, у якой узялі ўдзел каля 40–50 тысяч чалавек, закончылася прыняццем рэзалюцый з шэрагам патрабаванняў да ўлады. У тым ліку маніфестанты патрабавалі правесці новыя парламенцкія выбары і лібералізаваць закон аб партыях, каб у выбарах маглі ўзяць удзел нефармальныя арганізацыі.

Такі «папяровы» вынік стаяння на Балотнай шмат каго расчараваў. З'явілася шмат каментараў наконт таго, што Балотная плошча стала сімвалам канца надзеяў на перамены. Агульную думку выказаў ліберальны інтэрнэт-партал «Грани»: «Улада не ўбачыла нічога, акрамя вялікай тусоўкі. Гэта тусоўка не была гатовая сядзець на плошчы да выканання сваіх патрабаванняў, таму што там айпад зарадзіць няма дзе. Так што рэвалюцыі не будзе».

Сапраўды, чаканні адносна 10 снежня ў грамадстве былі каласальныя. Напярэдадні тых падзей «Газета. Ру» пісала: «Трэба зразумець, што пратэстная актыўнасць расійскіх грамадзян перайшла ў новую якасць. Але не меней важна іншае: здаецца, упершыню за дваццаць гадоў столькі людзей выйшлі не патрабаваць памяншэння тарыфаў, падвышэння заробкаў, а адстойваць закон і свае грамадзянскія правы. Выйшлі не апазіцыянеры, не рэвалюцыянеры, выйшлі дзясяткі тысяч грамадзян. Упершыню масава выйшла моладзь. Людзі, якія ўзурпавалі ўладу ў краіне, не могуць рабіць выгляд, што нічога не заўважаюць. Гэта стварае ўнікальную магчымасць прымусіць іх да перамоў. І калі гэты шанец будзе ўпушчаны, такой магчымасці не будзе яшчэ шмат гадоў».

Свой унёсак у гіпербалізацыю значэння 10 снежня ўнесла і ўлада. Па афіцыйных СМІ пачала гуляць інфармацыя пра тое, што на суботу апазіцыя, за якой быццам стаіць Дзярждэп ЗША, прызначыла ці штурм Крамля, ці лівійскую рэвалюцыю. У сеціве быў нават змешчаны сцэнар рэвалюцыі, якую назвалі белай з-за цяперашняй зімы.

Вось галоўныя этапы белай рэвалюцыі: «Задоўга да выбараў пачынаецца праект «Навальны». Ён павінен быў сабраць разнастайныя сілы. Лібералаў, нацыяналістаў, папросту незадаволеных. Да раскруткі яго ў інтэрнэце падключыліся спецыяльна створаныя падраздзяленні ЦРУ. Такім чынам Навальны апынаецца ў «топах» сацыяльных сетак. Пачынаецца новы этап — канселідацыя. Навальны кідаецца то да лібералаў, то да нацыяналістаў. Перад выбарамі Навальны і яго кампанія раскручвае тэрмін «партыя жулікаў і злодзеяў і г.д.».

Не дзіўна, што пасля такіх жахаў усе чакалі мітынг як нешта фенаменальнае. Аднак нічога надта незвычайнага, як было сказана вышэй, не адбылося. Хіба што фінал Балотнай плошчы выклікаў новую серыю скандалаў у апазіцыйным полі. Яго рэзідэнты пачалі шукаць стрэлачнікаў.

Некаторыя каментатары павесілі ўсіх сабак на арганізатараў-апартуністаў. «Ключавая памылка была здзейснена за некалькі дзён да акцыі, калі народная ініцыятыва пратэставаць у непасрэднай блізкасці ад Крамля і Дзярждумы была спрытна падменена стаяннем на Балотнай. І па форме і па змесце гэта было самае сапраўднае махлярства. Ніякія аргументы пра «не падстаўляць народ пад дубінкі» не вытрымліваюць крытыкі. Або вы змагаецеся за свабоду, або трываеце гэты рэжым. «Той, хто аддае сваю свабоду за бяспеку, не атрымлівае ні таго, ні іншага». І не важна, Джэферсан ці Франклін гэта сказаў» («Грани»).

Валерыя Навадворская лічыць, што акцыя правалілася з-за




ідэйнай мазаічнасці апазіцыі. «Лютьі 1917 года на сучасным парадыйным узроўні. Белыя шарыкі і белыя стужачкі, мабыць, азначалі капітуляцыю перад логікай, разумным сэнсам і добрым густам. У лютым 1917-га па плошчах не бегалі нацыяналісты з чарнасоценных арганізацый, а тут і яны ўліліся ў агульныя рэвалюцыйныя шэрагі. Над плячам прагучаў савецкі гімн (гэта як калі б у лютым 1917-га рэвалюцыянеры спявалі «Боже, Царя храни!»). Хоць як лёгка было сабраць прыстойных людзей для прыстойнай рэзалюцыі! Проста даць мітынгу слоган: «Вяртанне да канстытуцыйных нормаў ельцынскага дэмакратычнага дзесяцігоддзя». Ці: «Далоў чэкісцкую хунту, не жадаем назад у СССР, хочам у Еўропу і ў NATO». Усё. Чырвонае і карычневае паскудзтва разбягаецца з дзікімі крыкамі. У бой ідуць адны дэмакраты. А так атрымаўся цырк».

Дарэчы, на прапуцінскіх сайтах неаднароднасць мітынгоўцаў ставяць у заслугу спецслужбаў.

«Улады стварылі ўсе ўмовы для таго, каб як мага больш жадаючых змагло патрапіць на мітынг, размываючы тым самым адзіную арганізацыю і адзіны настрой у арганізатараў. У выніку публіка абсвістала аратараў. Адны ненавідзелі лібералаў на чале з Касьянавым і Нямцовым за тое, што тыя «прадаліся амерыканцам». Іншыя ненавідзелі ліберал-нацыяналістаў, трэція... Ну і гэтак далей. І мітынг скончыўся нічым. Мабыць, нездарма мы плацім падаткі. І нашы спецслужбы, паліцыя і іншыя дзяржаўныя структуры не дарма ядуць свой хлеб» («По существу»).

Сустракаюцца і проста катэгарычныя высновы: «Народ не гатовы да рэвалюцый. Менавіта таму любыя рэвалюцыйныя і экстрэмісцкія лозунгі, вымаўленыя са сцэны мітынгу Нямцовым, Крыловым, Касьянавым і іншымі радыкальнымі «лідарамі апазіцыі» былі асвістаныя» (Лента.ру).

Зараз апазіцыя знаходзіцца ў стане апатыі. Амбіцыі яе вельмі сціплыя. «Хуткаспелая «рэвалюцыя» цяпер паставіць нас перад сумным фактам адсутнасці лідараў, структуры і падтрымкі насельніцтва. Наша галоўная задача на дадзены момант — атрымаць магчымасць рэгістрацыі нацыяналістычнай партыі, легальная прапаганда нашых ідэй сярод насельніцтва», — піша «Русская линия», адзін з рэсурсаў рускіх нацыяналістаў. Некаторыя апазіцыйныя сайты ўжо канстатуюць, што сабраць два мільёна подпісаў для ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах (так патрабуе закон аб выбарах прэзідэнта) не пад сілу ніводнаму кандыдату «з вуліцы».

Аднак не ўсё так сумна. Як ні парадаксальна, аднак цяпер суб'ектам рэвалюцыі становіцца ўлада. Пры ўсіх правалах апазіцыі 10 снежня Крэмль не можа ігнараваць той факт, што на вуліцы выйшлі дзясяткі тысяч людзей, прычым тое былі не палітыкі, а звычайныя грамадзяне, абражаныя несправядлівасцю ў падліку іх галасоў. Гэта патрабуе змены дыскурсу ўлады, які на працягу 10 гадоў будаваўся на тэзісе пра ўсенародную любоў да Пуціна. Пытанне — у якім накірунку будуць рэформы? Лібералізацыя? Удасканаленне маніпуляцый? Імпарт беларускай мадэлі?

Пакуль Крэмль трымае паўзу. Аднак кожны з такіх зігзагаў здольны парушыць баланс сіл і інтарэсаў сярод чыноўнікаў і спарадзіць незадаволеныя фракцыі ў вертыкалі. І галоўнае, пад пагрозай апынуўся пакт Мядзведзеў — Пуцін праз ракіроўку. Менавіта гэтая дамова выклікае абурэнне простых людзей, якім не падабаецца тое, што за іх усё вырашылі.

Як піша «Независимая газета»: «Пасля суботніх мітынгаў Расія моцна змянілася. Не ў тым сэнсе, што жыццё заўтра можа пайсці нейкім іншым шляхам. У гэтым плане ўсё, застаецца, па-ранейшаму: кармушкі захаваны і чакаюць, калі да іх прысмокчуцца тыя палітычныя сілы, што былі паспяховыя на выбарах 4 снежня. Аднак пытанні, якія заставаліся нязменнымі на працягу шматлікіх гадоў, сёння паўстаюць зусім па-іншаму».

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Эксперты згодныя з уладамі, што ў бліжэйшай перспектыве расійская падтрымка дапаможа прыпыніць негатыўныя тэндэнцыі ў беларускай эканоміцы. Аднак у стратэгічным плане гэта хутчэй зло, чым пазітыў, — лічаць яны. Расійская дапамога адсоўвае на нявызначаны тэрмін рынкавыя рэформы ў Беларусі і ўмацоўвае цяперашнюю эканамічную мадэль. Атрымаўшы расійскую дапамогу, з рынкавымі зменамі можна і пачакаць. Больш таго, шматлікія беларускія эксперты ўпэўненыя ў тым, што Расіі патрэбна менавіта слабая Беларусь, у якой спачатку можна купіць усё, а потым далучыць яе да Расіі, што, як заяўляў раней прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін, было б «пажадана». «Гэта траянскі конь, які здольны не толькі пазбавіць Беларусь незалежнасці, але і Лукашэнку ўлады», — лічаць эксперты.

**«Независимая газета» (Расія)**

У Беларусі шматлікія эксперты лічаць, што канчатковая мэта Расіі — далучыць іх краіну да сябе. Аднак у што абыдуцца Расіі яе амбіцыі? Досвед Еўрасаюза, дзе багацейшыя краіны — Германія і Францыя — фінансуюць грэчаскіх і італьянскіх банкрутаў, паказвае, у што можа выліцца падобнае аб'яднанне. Таму нават пасля стварэння Еўразійскага саюза Расія наўрад ці стане матчынай структурай для Беларусі. Гэта значыць, што, валодаючы Беларуссю дэ-факта, Расія пакіне яе дэ-юрэ незалежнай і палітычна, і эканамічна. Прынамсі, каб не субсідаваць яе эканоміку сабе ў шкоду.

**«Фокус» (Украіна)**

Арышт міліцэйскага кіраўніка супаў па часе з чысткай у шэрагах беларускіх прадпрымальнікаў, распачатай з арыштам галоўнага фінансіста Аляксандра Лукашэнкі Віктара Шаўцова і наступнымі ўцёкамі з краіны іншага вядомага прадпрымальніка Уладзіміра Пефціева. Паколькі само функцыянаванне беларускай улады акружана завесай сакрэтнасці, цалкам параўнальнай з таямніцамі савецкага двара ці паўночна-карэйскага палітбюро, назіральнікам застаецца толькі меркаваць пра чыннікі такіх сур'ёзных змен. Але арышты і знікненні — зусім не сведчанні ўпэўненасці ўлады ў сабе. Усё гэта сведчыць пра тое, што развіваецца паранойя чалавека, для якога ўтрыманне ўлады стала самамэтай і які страшыцца любых, нават самых малаважных змен у сваім становішчы, лічачы, што першая ж саступка ўласнаму насельніцтву прывядзе яго на эшафот. У такой сітуацыі ворагамі Лукашэнкі становяцца ўсе — суграмадзяне, удзельнікі акцый пратэсту, уласныя «кашалькі», сілавікі, расійскія кіраўнікі, еўрапейцы, ну, словам — усе-ўсе-ўсе.

**«Политком.ру» (Расія)**

Продаж Маскве Белтрансгаза паскорыць васалізацыю Беларусі, якая ўсё глыбей валіцца ў кішэню расійскіх фірмаў і банкаў. «Рускія за 50 працэнтаў Белтрансгаза пагадзіліся на ўсе нашы ўмовы», — пахваліўся ў мінулую пятніцу Лукашэнка. Аднак расійскія каментатары бачаць гэта крыху інакш. «Газпрам Усяе Русі Вялікай і Белай» — так іранічна пракаментавала дамову роднага канцэрна расійскае прэс-агенцтва «Фінмаркет». І падкрэсліла: гэта першы поспех стратэгіі Газпрама, які на працягу гадоў імкнецца «мець ролю міністэрства газавай прамысловасці СССР». 20-я ўгодкі распаду Савецкага Саюза Газпрам адзначыў сімвалічна — пераадольваючы вынікі рашэнняў, якія былі прынятыя ў Белавежскай пушчы.

**«Gazeta Wyborcza» (Польшча)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### КАЗАХСТАН. ГОЛЫ ПРАТЭСТ

Мода на тое, каб агаляцца ў імя палітычных мэтаў, працягвае трыумфальна крочыць па планеце. Цяпер яна дасягнула Казахстана, дзе 20 жанчын, якія займаюцца фатаграфіяй, зняліся для спецыяльнага календара. Увогуле, самі яны кажуць, што зрабілі гэта ў мэтах філантропіі. Усе прыбыткі з продажу календара плануецца накіраваць на аперацыі двух хворых дзяцей. Аднак акцыя набыла палітычны падтэкст, паколькі апошнім часам у свеце вельмі модна дэманстраваць сваё цела як сродак палітычнай маніфестацыі. Самы свежы прыклад — кампанія «Голае цела — не парнаграфія», якая праходзіць у Кітаі. Яе ўдзельнікі выкладваюць у сеціва свае выявы ню ў знак пратэсту супраць арышту кітайскага мастака-дысідэнта, якога пасадзілі за тое, што ён быццам рабіў парнаграфічныя здымкі. Нічога дзіўнага, што ў Казахстане вырашылі, нібыта жанчыны-фатографы таксама пратэстуюць супраць аўтарытарнага рэжыму Назарбаева. У той жа час частка грамадства, наадварот, ускосна пабачыла тут руку ўлады, якая зараз актыўна змагаецца з паўзучай ісламізацыяй грамадства. У выніку дэмакраты крытыкуюць аўтараў календару за дыскрэдытацыю іх руху. У той жа час ісламісты атакуюць дзяўчын за амаральныя паводзіны, якія быццам магчымы толькі пры Назарбаеве. Між тым, самі ініцыятары праекта ўжо абяцаюць зрабіць выпуск такіх календароў рэгулярным — запрасіць зняцца для наступнага жадаюць пішучых жанчын-журналістак, блогерш, пісьменніц, паэтак.

**Паводле казахскай прэсы**

### ІРАН. АДКРЫТА ВІРТУАЛЬНАЯ АМБАСАДА ЗША




Амерыканскае амбасада вяртаецца ў Іран пасля доўгай адсутнасці. Нагадаем, што амбасада ЗША не працуе ў Тэгеране з 1979 года, калі была зачыненая з прычыны атакі ісламскіх фундаменталістаў. Пасля гэтага краіны не маюць дыпламатычных кантактаў. Няма іх і зараз. Таму амбасада адчынена толькі віртуальна на сайце http://iran.usembassy.gov. Тут можна атрымаць агульную інфармацыю пра ЗША, а таксама запоўніць заяву на візу, якую іранцы могуць атрымаць у амбасадзе ЗША ў іншай краіне. Хілары Клінтан, дзяржаўны сакратар Злучаных Штатаў, лічыць, што новы сайт дазволіць наладзіць камунікацыю простых іранцаў і амерыканскага ўраду і зруйнуе жалезную заслону, якой урад Ірану акружыў сваіх грамадзян. Афіцыйны Тэгеран, між тым, ужо назваў адкрыццё віртуальнай амбасады правакацыяй і ўмяшаннем ва ўнутраныя справы Ірану.

**Паводле французскай прэсы**

### УКРАІНА. ДАЧКА ПАДМЯНІЛА МАЦІ



Яўгенія, дачка Юліі Цімашэнка, падмяніла маці на яе пасадзе. Яўгенія, здаецца, вырашыла ўсур'ёз пайсці ў палітыку. Яе дэбютам стаў выступ на з'ездзе Еўрапейскай народнай партыі — інтэрнацыянале еўрапейскіх кансерватараў 7 снежня ў Марселі. У гэтае аб'яднанне таксама ўваходзіць партыя Юліі Цімашэнка «Бацькаўшчына». Выступаючы на форуме, дачка экс-прэм'ера Украіны ад імя маці папрасіла Еўропу падвоіць высілкі па набліжэнні Украіны да ЕС і заклікала еўрапейскую супольнасць увесці санкцыі супраць адміністрацыі Віктара Януковіча. Аўдыторыя сустрэла выступ на ўра. Што да Яўгеніі, то яе палітычная будучыня цяпер будзе залежыць ад таго, ці ўключыць партыя «Бацькаўшчына» яе ў свой спіс на парламенцкія выбары наступнага года. Некаторыя кажуць, што, магчыма, дзяўчыне, якая ў паліцыцы максімум месяц, нават дадуць першы радок у спісе.

**Паводле ўкраінскай прэсы**

### РАСІЯ. ЯК КАЛІНІНГРАД АПЫНУЎСЯ НА ДНЯСТРЫ

У аналы палітычных кур'ёзаў вартыя ўвайсці апошнія выбары ў Думу ў Калінінградзе. У Калінінградскай вобласці «Адзіная Расія» (ЕР) афіцыйна набрала 37%, а КПРФ — 25,5%. Парадокс сітуацыі ў тым, што па ўсіх апытаннях рэйтынг ЕР у вобласці не больш за 15–20 працэнтаў. Лічба 37 працэнтаў тлумачыцца тым, што да гэтага анклаву Расіі прыпісаны другі фактычны анклаў, але непрызнаны — Прыднястроўская Малдаўская Рэспубліка. У ранейшыя гады непрызнаная рэспубліка, у якой на сёння жыве каля 160 тысяч грамадзян Расіі, была «прывязана» да Калужскай вобласці, але зараз Масква, ведаючы пра крайнюю непапулярнасць ЕР у Калінінградзе, вырашыла прышпіліць Левабярэжжа Днястра да Калінінградскай вобласці. Усяго ў Прыднястроўі прагаласавала 51 тысяча грамадзян Расіі, што ў маштабах Калінінградскай вобласці вельмі шмат. «Адзіная Расія» атрымала ў Прыднястроўі 74%, а КПРФ — толькі 8%. У выніку атрымалася, што жыхары былога Кёнігсберга, абраўшы адну партыю, атрымалі ва ўладзе зусім іншую, і ўсё гэта дзякуючы «вынаходлівасці» Крамля. Самім калінінградцам быць у адной выбарчай акрузе з Ціраспалям яўна не спадабалася. 7 снежня тысячы чалавек пратэставалі на цэнтральнай плошчы горада супраць прывязкі да Прыднястроўя.

**Паводле расійскай прэсы**

▸ **ВЫБАРЫ**

# УРОКІ СМІРНОВА

**Алег НОВІКАЎ**



**Пасля 20 гадоў пры ўладзе прыднястроўскі прэзідэнт Ігар Смірноў павінен сысці. У Прыднястроўі пачынаецца новая эпоха.**

Адзін з афіцыйных тытулаў Смінова — «Бацька рэспублікі». А вось статыстыка яго былых перамог на выбарах прэзідэнта. Па выніках галасавання 1991 года Смірноў атрымаў 65,4% галасоў, у 1996 годзе — 71,94%, у 2001-м за яго аддалі галасы амаль 82% і ў 2006-м — 82,4% галасоў.

Таксама можна ўзгадаць прынцып працы прыднястроўскіх каналаў тэлебачання. Так, кожныя тры гадзіны транслююць апошняе інтэрв'ю кіраўніка дзяржавы. Нават калі ён даў тое інтэрв'ю тыдзень таму.

Прапагандысцкая кампанія «За Смірнова» па сутнасці вельмі падобная на кампанію «За Беларусь» і «Мы беларусы». Прынцып на берагах Днястра і Свіслачы адзін і той жа: прадстаўнікі розных сацыяльных катэгорый — ад настаўнікаў да студэнтаў і вайскоўцаў — выказваюць сваю падзяку дзеючаму прэзідэнту і заклікаюць за яго галасаваць.

Адзіным прыднястроўскім ноў-хаў у гэтай агітацыйнай кампаніі быў ролік з «патрыётам». Па сюжэту яго герой, 50-гадовы ветэран вайны з Малдавіяй 1992 года, разбірае і збірае аўтамат Калашнікава і тлумачыць сыну, што галасаваць за гаранта — тое ж самае, што абараняць незалежнасць 20 гадоў таму. Хаця з улікам таго, што ворагамі прыднястроўскай незалежнасці, па словах ветэрана, выступаюць салдаты NATO, розніца паміж агітпропам Смірнова і Лукашэнкі не такая ўжо і вялікая.

І ўжо проста прыступ дэжа-вю выклікалі нататкі ў блогах пра выкарыстанне ў Ціраспалі адміністратыўнага рэсурсу. Адзін з блогераў так апісвае будні выбарчай прэзідэнцкай кампаніі. «Мама мая распавядае мне, што ў школе, дзе яна працуе, пару дзён таму настаўнікам загадалі ісці ў гарадскі ДК на перадвыбарную сустрэчу з прэзідэнтам. Прычым прымусілі распісацца, што прыйдуць, і палохалі, што строга праверацць яўку. Пасля сустрэчы мама распавядае, які ў нас залаты прэзідэнт, разумны, так хараша кажа. Асабліва мне спадабалася: «Яго так усе любяць і паважаюць, што народу сабралася аж поўная зала».

Аднак выбары ў Беларусі і ў Прыднястроўі закончыліся па-рознаму. Смірноў прайграў. І прычым параза для палітыка яго статусу, бацькі прыднястроўскай нацыі, папросту катастрафічная. Атрымліваецца, што за 5 гадоў давер да палітыка скараціўся ў 4 разы — з 82 да 23 працэнтаў.

Такі фантастычны кантраст лічбаў прымушае думаць, што ў прыднястроўскім ЦВК лічаць неяк дзіўна. І сапраўды, за апошнія 5 гадоў нешта змянілася. Прынцып фармавання выбарчых камісій захаваўся — трэцяя частка сяброў камісій прызначаецца прэзідэнтам, трацiна — Вярхоўным саветам, столькі ж — тэрытарыяльнымі ўладамі. Аднак за гэты час змяніўся склад Вярхоўнага Савета, дзе большасць дэпутатаў прадстаўлены падкантрольнай холдынгу-манапалісту «Шэрыфу» апазіцыйнай партыяй «Абнаўленне». Зразумела, што ў камісіях на гэты раз лічылі па іншаму прынцыпу, і дзяжурнай элегантнай перамогі ў Смірнова не атрымалася.

Канфлікт Смірнова з бізнэс-структурамі «Шэрыфа», якіх падтрымала Масква, у выніку аказаўся фатальным для сістэмы. Атрымліваецца, знешні фактар быў вырашальным. Інакш бы першае месца 11 снежня атрымаў не прамаскоўскі Анатоль Камінскі, а незалежны кандыдат Яўген Шаўчук, якога ведаюць як крытыка карупцыі ў смірноўскім клане.

Катастрофа Смірнова мае шмат аспектаў. Гэта, безумоўна, перш за ўсё асабістая трагедыя. Смірноў увайшоў у палітыку як кумір масаў. Пад яго кіраўніцтвам рабочыя змагаліся ў час вайсковага канфлікту з Малдавіяй, ён стаяў каля вытокаў прыднястроўскай дзяржаўнасці. Калі малдаўскія спецслужбы выкралі Смірнова ў Кіеве і тайна адвезлі ў кішынёўскую турму, жанчыны Ціраспаля па сваёй ініцыятыве заблакавалі чыгуначны рух і прымусілі Малдавію вызваліць палітыка.

Наступны Смірноў — гэта Смірноў-прэзідэнт, якога мы ведаем па прапагандысцкіх роліках таго ж прыднястроўскага тэлебачання. Там ён малюецца як бацька вялікага сямейства, гарант незалежнасці і сацыяльнай стабільнасці. Усё гэта за кошт Масквы, якая шчодра дае Смірнову грошы ў піку малдаўскаму прэзідэнту Вароніну, з якім у Крамля канфлікт.

І вось трэці Смірноў — на першых кадрах, знятых пасля выбараў 11 снежня. Гэта хутчэй разгублены стары чалавек, які чагосьці баіцца. І, хутчэй за ўсё, сюжэты з удзелам Смірнова будуць яшчэ больш мінорнымі. Як вядома, ён з'яўляецца фігурантам буйной справы наконт выкрадання расійскіх бюджэтных сродкаў, якія ішлі для пенсіянераў рэгіёну. У Маскве ўжо арыштаваны яго сын Алег Смірноў. Па-сутнасці, тое, што Смірновы кралі грошы, гэта «сакрэт палішынеля», аднак з улікам таго, як ён працiвіўся інструкцыям Масквы, яго напэўна чакае паказальная порка.

Такі фінал лагічны, калі прачытаць ацэнку прыднястроўскай вертыкалі, якую год таму зрабіла агенцтва Dnister.ru: «Прыднястроўскія чыноўнікі страцілі гнуткасць мыслення, самакрытычнасць. Калі ты шмат гадоў кіруеш цэлай рэспублікай, з часам пачынаеш сам верыць у тое, што ты цар, уладар, адзіны дасведчаны, каму як жыць, у чым выратаванне, якія каштоўнасці патрэбныя грамадству, а якія, наадварот, яго раскладаюць. Яны гатовыя даваць парады не толькі сваім падпарадкаваным, але і звышдзяржавам. Не выпадкова мы назіраем мноства публікацый у мясцовай прэсе і рэпартажаў па тэлебачанні ПМР, перапоўненых «мудрымі павучаннямі» на тэму, як павінна паводзіць сябе Расія, хто там здраднік, а хто наадварот, у чым складаюцца геапалітычныя інтарэсы РФ, і гэтак далей».

Эксперты пішуць, што адзіны шанец у Смірова — згуляць у паўднёва-асецінскі варыянт. Выводзіць прыхільнікаў на вуліцы і дабівацца новых выбараў. Аднак такая задача дастаткова складаная, паколькі выступаць трэба фактычна супраць Масквы, якая падтрымлівае аднаго з апазіцыйных кандыдатаў. Між тым, ідэнтычнасць, якую фармаваў Смірноў у жыхароў Прыднястроўя, не пасуе такім заклікам. Кодэкс прыднястроўца — гэта камбінацыя ідэнтычнасцяў: трэба быць трошкі рускім, трошкі сумаваць па часах СССР, трошкі крытыкаваць Крэмль, калі ён пачынае раптам сябраваць з Кішынёвам. Аднак мадэль антымаскоўскага руху ў Прыднястроўі выглядае цяжка.

І цяжка сабе ўявіць, што нехта сур'ёзна будзе абараняць Смірнова. Інтэрнэт-форумы Прыднястроўя дыхаюць надзеямі на новае жыццё. «Падобна, у нас змены, вялікія змены, спадзяюся, да лепшага. Цяпер пабягуць з Прыднястроўя міністры і чынушы, якія вольна адчувалі сябе пры Смірнове».

Цікава, ці сочаць за падзеямі ў Прыднястроўі нашы чыноўнікі?

СМІ

# У ЭФІРЫ — ГРАМАДЗЯНЕ

**30 гадоў таму Франсуа Мітэран дазволіў французам ствараць FM-станцыі, якім дзяржава павінна не толькі надаваць частоты для вяшчання, аднак і дапамагаць грашыма. За тры дэкады так званыя грамадскія радыёстанцыі сталі адным з падмуркаў французскай дэмакратыі. З супрацоўнікам адной такой радыёстанцыі Аляксандрам Чукаевым размаўляе журналіст «НЧ» Алег Новікаў.**

***— Адкуль увогуле ўзялося ў Францыі так званае грамадскае радыё?***

— Яго вытокі варта шукаць у прэзідэнцкай кампаніі 1981 года. Напярэдадні выбараў сацыялісты зразумелі, што не могуць перамагчы без сваіх СМІ. Але ўплывовых СМІ ў іх не было. Справа ў тым, што на той час прыватных тэлеканалаў або незалежных радыёстанцый у краіне не існавала. Гэтыя медыя былі цалкам дзяржаўным. А паколькі пры ўладзе былі правыя, яны папросту не пускалі ў эфір палітычных канкурэнтаў. У такой сітуацыі стаўку было вырашана зрабіць на пірацкія радыёстанцыі. У другой палове 1970-х яны былі вельмі моднымі, асабліва ў прыгарадах. Вось так самыя вядомыя левыя палітыкі кшталту Ларана Фабіуса або Жака Ланга адправіліся ў падпольныя студыі, каб даваць інтэрв'ю ці рабіць каментары. Гэта выклікала вялікі інтарэс да пірацкіх станцый і сапраўды садзейнічала перамозе Франсуа Мітэрана на выбарах. Пасля прэзідэнт у якасці падзякі легалізаваў медыя-саюзнікаў — падпісаў закон, які дазваляе любой групе грамадзян атрымаць FM-частату для радыёвяшчання пры ўмове выканання шэрагу патрабаванняў.

***— Што гэта за патрабаванні?***

— Адпаведна закону, на студыі грамадскага радыё забараняюцца ўсе формы наёмнай працы або ганарары. Таксама такія радыёстанцыі не могуць трансляваць рэкламу. Яны таксама абавязаны аплачваць камунальныя выдаткі за студыю. Затое дзяржава дапамагае ім сродкамі на набыццё апаратуры і аплаты арэнды. Праўда, грошы проста так не даюцца. Існуе спецыяльная камісія, якая сочыць за тым, ці сапраўды станцыя карыстаецца цікавасцю ў аўдыторыі. Інакш фінансаванне могуць скараціць. Гэта значыць, што стваральнікам станцыі давядзецца ўкладаць свае сродкі ці ўвогуле спыніць трансляцыі.

***— Ці ёсць нейкія этычныя патрабаванні да супрацоўнікаў станцый грамадскага радыё?***

— Гэтыя правілы фактычна не адрозніваюцца ад працоўнага кодэкса звычайнай рэдакцыі.



Дыджэям забаронена прапаганда ксенафобскіх і антыгуманных ідэяў. У дадатак існуе моцная ўнутраная цэнзура. Ёсць шмат выпадкаў, калі за абразу палітыкаў грамадскае радыё выклікалі ў суд і пасля давалі буйны штраф. Напрыклад, адзін з журналістаў нашай станцыі быў злоўлены на рэпартажы з турмы, дзе, па яго словах, назіральнікі быццам збівалі вязняў. Аказалася, што на той час ніякіх канкрэтных доказаў гэтага аўтары матэрыялу не мелі. Пасля быў суд. Нам давялося шукаць каля 20 000 тысяч еўра для аплаты штрафу.

***— Колькі ўсяго ў Францыі грамадскіх радыёстанцый?***

— Калі Мітэран падпісваў той закон, якіх толькі радыёстанцый не ўзнікла. Быў нават польскамоўны праект, што прыдумалі дысідэнты з польскай «Салідарнасці», якія эміґравалі пасля ўвядзення ў Польшчы вайсковага становішча. Аднак доўга, на жаль, ён не пратрымаўся. У выніку зараз мы маем каля 300 станцый. Самая папулярная з іх — «Le Monde Libertare», дзе я ў вольны ад працы слесарам час вяду сваю праграму.

***— Распавядзіце трошкі пра вашу станцыю.***

> Існуе спецыяльная камісія, якая сочыць за тым, ці сапраўды станцыя карыстаецца цікавасцю ў аўдыторыі. Інакш фінансаванне могуць скараціць

— Радыё было створана ў 1981 годзе пры Федэрацыі анархістаў Францыі, якая ў сваю чаргу мае статус зарэгістраванай грамадскай арганізацыі. Тое, што мы інфармацыйная структура Федэрацыі анархістаў, дазваляе нам у выпадку фінансавых праблем карыстацца яе падтрымкай. Рашэнню анархістаў заснаваць сваю станцыю папярэднічалі доўгія дэбаты. Праціўнікаў радыё ўдалося пераканаць, толькі калі ім нагадалі, што існуе даўняя традыцыя выкарыстання анархістамі радыё ў якасці сродку прапаганды. Мала каму вядома, што падчас Кранштацкага антыбальшавіцкага паўстання 1921 года матросы спрабавалі наладзіць сваё радыё.

Першыя трансляцыі нашага радыё пачаліся ў студыі памерам 12 квадратных метраў. Рэдакцыя складалася ўсяго з 6 чалавек. Для параўнання, зараз у нас працуюць больш за 100 чалавек. У нас сетка з 60 праграм.

***— Як стаць супрацоўнікам грамадскага радыё?***

— Паўсюль адзін і той жа прынцып набору валанцёраў. Існуе рэдакцыя, якой трэба прынесці пілот праграмы. Калі яна падабаецца рэдакцыі, праграму ставяць у эфір. І тут перад сябрамі рэдакцыі стаіць вялікая задача: яны павінны быць упэўненыя, што бяруць чалавека, які можа рабіць праграмы адпаведна графіку і да таго ж на бясплатнай аснове. Вельмі часта праграмы і нават цэлыя станцыі зачыняліся з-за няздольнасці супрацоўнікаў працаваць у сістэматычным рэжыме. Ёсць іншыя пагрозы. Так, калі ў Францыю прыйшоў хіп-хоп, праграма «Reveil Hip Hop» на «Le Monde Libertare» была вядомай усім французскім прыхільнікам гэтага стылю. Яе стваральнікі з часам перайшлі працаваць на прафесійнае радыё, стварыўшы прэцэдэнт. Цяпер праца на грамадскіх радыёстанцыях шмат кім разглядаецца як першы этап кар'еры дыджэя.

***— Чаму Сацпартыя або Кампартыя, якія маюць нашмат больш грошай, чым анархісты, не змаглі стварыць сваёй станцыі?***

— Такія спробы сапраўды мелі месца, аднак аказаліся правальнымі. Магчыма таму, што сацыялісты і камуністы былі парламенцкімі партыямі, якія вядуць тонкую палітычную гульню. А «Le Monde Libertare» — рупар анархістаў і папросту падтрымлівае любы бунт. У час выбуху сацыяльнай актыўнасці радыё ператвараецца ў своеасаблівы інфацэнтр пратэстнага руху. Так было, напрыклад, у 1986-м, калі «Radio libertaire» стала рупарам студэнцкіх пратэстаў. Праўда, часам гэта каштуе нам праблем з паліцыяй. Так, улетку 1983 года спецназ уварваўся ў студыю, выбіўшы дзверы. Уся апаратура была зламаная. Паколькі на той момант месца для студыі не было, прыходзілася весці перадачы з арэндаванага грузавіка.

***— А ці ёсць правыя грамадскія радыёстанцыі?***

— Так. Самым уплывовым лічыцца «Radio Courtoisie». Гэта цікавая станцыя, паколькі яе заснавальнікам быў Жан Ферэ, прыхільнік рэстаўрацыі манархіі, хаця абсалютная большасць французскіх правых — рэспубліканцы.

***— Якая будучыня ў грамадскіх радыёстанцый?***

— Думаю, што зараз для французскіх грамадскіх радыё пачынаецца новы этап. Галоўны выклік — інтэрнэт. З аднаго боку, ён забірае ў нас аўдыторыю, з іншага — цяпер мы можам вяшчаць па ўсяму свету.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### АЛЕКС САЛМОНД



Кіраўнік ураду шатландскай аўтаноміі, лідар мясцовай партыі нацыяналістаў у адкрытым лісце атакаваў прэм'ера Дэвіда Кэмерана за яго нежаданне падтрымаць змены ў статуце ЕС. Рэформы, якія прапанавалі Францыя і Германія, тычацца бюджэтнай палітыкі аб'яднання. Кэмеран, які даўно мае імідж еўраскептыка, адзіны з лідараў еўрапейскіх дзяржаў заявіў, што будзе блакаваць любыя структурныя рэформы ЕС. Прэм'ер кажа, што дзейнічае ў абарону фінансавых колаў краіны. На думку Салмонда, тое, што робіць Кэмеран, — гэта «вялікая памылка», якая можа мець негатыўныя наступствы для шатландцаў. Як вядома, праграма шатландскіх нацыяналістаў прадугледжвае ўключэнне Шатландыі ў зону еўра. Ключавая фраза тэксту Салмонда наступная: «Апошнія падзеі даказваюць, што Шатландыі жыццёва важна мець права голасу ў дэбатах, якія тычацца яе нацыянальных інтарэсаў». Нарэшце, Салмонд патрабаваў правядзення кансультацый прэм'ера з лідарамі адміністратыўных адзінак, якія ўваходзяць у Аб'яднанае Каралеўства — Паўночная Ірландыя, Шатландыя і Уэльс. Заяву Салмонда ўжо падтрымаў лідар Уэльсу Кевін Джонс. Увогуле, Дэвіду Кэмерану вельмі дасталася за антыеўрапейскі ўчынак. На думку некаторых экспертаў, гэты крок знішчыў усе еўрапейскія дыпламатычныя заваёвы Вялікабрытаніі за 38 гадоў яе сяброўства ў ЕС.

### НУРСУЛТАН НАЗАРБАЕЎ



Прэзідэнт Казахстану пацешыў свой народ, падараваўшы яму новае свята. Парламент Казахстана прыняў закон, які засноўвае дзяржаўнае свята — Дзень першага прэзідэнта, які будуць святкаваць 1 снежня. У гэты дзень, 20 гадоў таму, Нурсултан Назарбаеў у выніку першых усенародных выбараў быў абвешчаны прэзідэнтам Казахстана. «Менавіта ў гэты дзень быў абраны першы прэзідэнт, быў усталяваны інстытут прэзідэнцтва Рэспублікі Казахстан, аказаўшы бясспрэчны ўплыў на ўвесь ход і развіццё нашай дзяржаўнасці. Аддамо належнае гэтаму», — сказаў дэпутат сената Анатоль Чаравікоў падчас галасавання наконт новай чырвонай даты календару. У звычайных людзей няма такой эйфарыі. На форумах можна прачытаць каментары кшталту: «Па логіцы, давядзецца адзначаць і дзень смерці першага прэзідэнта». Дарэчы, з тымі выбарамі 1990 года шмат чаго не зразумелага. Яны прайшлі на безальтэрнатыўнай аснове. ЦВК адмовілася зарэгістраваць кандыдата ад дэмакратаў, паколькі той не паспеў падаць неабходную колькасць подпісаў. Хоць, па словах самога кандыдата, напярэдадні падачы дакументаў у ЦВК на яго выбарчы штаб быў здзейснены напад і выкрадзены ўсе лісты з сабранымі подпісамі.

### ФРАНСУА БАЙРУ

Лідар французскай ліберальнай партыі Modem, які на мінулым тыдні заявіў пра намер балатавацца ў прэзідэнты, зрабіў сапраўдную сенсацыю. Толькі за адзін тыдзень яго рэйтынг вырас з 6 да 13 пунктаў. Такім чынам, па папулярнасці ён дагнаў кандыдата Нацыянальнага фронту Марыну Ле Пэн. Гэта, праўда, менш, чым у Нікаля Сарказі і сацыяліста Франсуа Аланда — фаварытаў кампаніі, якія маюць адпаведна 25 і 34 працэнты падтрымкі. Аднак недаацэньваць перспектывы Байру нельга. Пакуль усё ідзе да таго, што Сарказі прайграе выбары, прадстаўніку сацыялістаў (як сведчаць вынікі апытанняў, калі б зараз быў другі тур, Сарказі б прайграў Аланду з розніцай у сем працэнтаў). Такі сцэнар значыць перазагрузку правай французскай сцэны і карт-бланш для Байру на тое, каб стаць яе новым лідарам замест Сарказі. Самі прыхільнікі Сарказі кажуць, што высокі рэйтынг Байру — выпадковасць, звязаная з медыйнымі абставінамі. Быццам сваёй папулярнасці лідар Modem абавязаны двум запар выступам на цэнтральных каналах тэлебачання. Так атрымалася, што астатнія кандыдаты ў гэты час былі занятыя нейкімі іншымі справамі і ў СМІ адсутнічалі.



▸ ЦІКАВА

# ЗАБОЙСТВА ВІЛЬГЕЛЬМА КУБЭ

## (ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ ЭСЭ)

◂ **Працяг. Пачатак у №42–46.**

Анатоль ВАЛАХАНОВІЧ

**Усё, што адбывалася 21 верасня, у дзень забойства Вільгельма Кубэ, у доме генеральнага камісара Беларусі, мы можам даведацца толькі са слоў самой Алены Мазанік. Другіх дакументальных крыніц няма.**



Марыя Осіпава

### Хроніка забойства

«Я предложила ему [офицеру] спуститься вниз позавтракать. А если позвонит телефон, я быстро вас позову, — сказала я. — Он охотно согласился… Я стала торопиться, каждую минуту могла возвратиться Янина. Обежав все комнаты и убедившись, что никого нет, я проскользнула в спальню Кубе. В руках у меня была мина, завернутая в детские штанишки, — скажу, в случае чего, искала, мол, здесь нитки для штопки. Когда я проходила комнаты, все время окликала жену Кубе, так как боялась, что, может быть, кто-нибудь еще есть в доме. В спальне я быстро положила мину между матрацем и пружинами, ближе к головной части кровати. Заложив мину, я села на кровать — проверила, не чувствуется ли мина… И вот тут-то все чуть не сорвалось…

Только я успела встать с кровати, как в дверях спальни появился дежурный офицер. Он подозрительно посмотрел на меня и строго спросил, что я здесь делаю одна, почему нахожусь в комнате, уборка которой поручена другой (все комнаты другого этажа убирала другая прислуга, а я убирала весь третий этаж, кабинет Кубе, столовую, комнату Аниты и еще несколько комнат для гостей). В эту минуту спустилась вниз Янина.

Янина была очень красивая девушка. Я знала, что она нравится этому офицеру и сейчас только она сможет меня выручить. Я обратилась к ней со словами: «Яня, дорогая, поцелуй, пожалуйста, господина офицера, он такой злой сегодня, обещай, что ты сегодня вечером с ним встретишься!» Янина кокетливо взглянула на офицера и, приблизившись, сочно поцеловала его в губы… Только после этого я объяснила офицеру, зачем я сюда пришла, и что мне тут надо. «Я хотела заштопать эти штанишки, а нитки находятся тут», — сказала я. После поцелуя Янины офицер хотя и подобрел, но строго сказал мне, чтобы я раз и навсегда запомнила, что, когда в комнате никого нет, я не имею права входить в нее. Я сказала, что этого больше никогда не будет, я больше никогда сюда не зайду, и попросила его, чтобы он не говорил об этом Кубе и Аните, а то мне здорово влетит.

Офицер внимательно осмотрел спальню, заглянул в тумбочку, открыл гардероб, поднял на кровати подушку, одеяло и сказал: «Можешь идти, русская свинья, чтоб твоего духу здесь больше не было!» Я еще раз извинилась и вышла. В кабинете Кубе я взяла пачку лучших сигарет и, отдавая их офицеру, сказала, что это ему за его доброту ко мне, что эти сигареты подарил мне сам господин Кубе. Он взял их с большим удовольствием, а я сошла вниз, взяла пальто, портфель, сумку и сказала, что с разрешения Кубе ухожу к зубному врачу. Если зуб удалю, то на работу больше не приду. Мне разрешили уйти…»

У 10 гадзін 15 хвілін раніцы Мазанік заклала міну.

11 гадзін. Марыю Барысаўну Осіпаву, Алену Рыгораўну Мазанік і яе сястру Валянціну Рыгораўну Шчуцкую з дзецьмі вывез за горад на грузавой машыне Мікалай Фурс — шафёр кінатэатра, дзе дырэктарам быў Мікалай Васільевіч Пахлябаеў.

Шафёр давёз жанчын да вёскі Вішнёўка. Далей праз вёску Вяча, пехам і на конях (падводзе) уцякачкі дабраліся да базы партызанскага атрада Фёдарава ў вёску Янушкавічы, якая месцілася ў 7 кіламетрах ад горада Лагойска.

Тут яны і даведаліся, што ноччу ў выніку выбуху міны Кубэ быў забіты. У кастрычніку 1943 года з Бягомльскага партызанскага аэрадрома жанчыны разам з Фёдаравым вылецелі ў Маскву.

22 верасня (серада). У першай гадзіне ночы Кубэ вярнуўся дадому і, сказаўшы Аніце, што дрэнна сябе адчувае, адразу лёг у ложак.

У 2 гадзіны 15 хвілін у спальні генеральнага камісара Беларусі выбухнула міна. Вільгельм Кубэ быў забіты. «Спасать было уже некого. От мужа почти ничего не осталось. Если бы я в этот вечер находилась ближе к его кровати, меня бы тоже разорвало», — расказвала пазней Аніта Кубэ.



Аніта Кубэ з сынамі

Міну, якой быў забіты Вільгельм Кубэ, вынайшлі англічане. Яна невялікая: 200 грамаў узрыўчаткі. Калі цыліндр дыяметрам 10 см і вышынёю 14 см у думках разрэзаць па вышыні ўздоўж напалам, палавінкі і будуць мінамі. У тарцы міны знаходзіцца адтуліна, куды ўстаўляўся механізм. На канцах упоперак на плоскасці былі прымацаваны два моцныя магніты. Спрацоўвае міна па прынцыпу супрацьдзеяння матэрыялаў. Свінец, як вядома, валодае пастаянствам да нагрузак. Калі на некалькіх свінцовых нітках падвесіць аднолькавы груз, праз нейкі час груз абарвецца амаль адначасова на ўсіх нітках.

Прынцып дзеяння механізма міны такі: спіральная спружына з сілай цягне свінцовую нітку. У разліковы (запраграмаваны) час свінцовая нітка абрываецца — спружына пасылае баёк у капсулу дэтанатара і адбываецца выбух. Усе спіральныя спружыны ў механізме аднолькавай сілы. А свінцовыя стрыжні (дрот), якія ўтрымліваюць спружыну, па дыяметру розныя. Чым меншы дыяметр, тым хутчэй будзе выбух і наадварот, чым большы дыяметр, тым больш часу на абрыў ніткі спружыны, і часу на ўзрыў будзе больш. Зыходзячы з гэтага прынцыпу і пабудавана сетка ўзрыву ад 1-й гадзіны да 48, чаргуючыся праз 3 гадзіны: 1, 3, 6, 9, 12, 15, 18, 21, 24, і гэтак далей.

Якога тэрміну механізм узрыву міны — указваецца адзнакай чорнай лічбы, прымацаванай да механізма. Спружына ў механізме заўсёды знаходзіцца ў сціснутым стане, яе ўтрымлівае загваздка. Каб загваздка выпадкова не выскачыла з гнязда (адтуліны міны), і не адбыўся раптоўны і незапланаваны самаспуск, загваздка замацавана другой загваздкай. Бяспека гарантавана на 100%.

Роўна за 24 гадзіны да ўзрыву трэба дастаць адну за адной дзве чэкі, надзець на канец механізма дэтанатар у форме латуннай трубачкі дыяметрам 8 мм, даўжынёю — 40 мм, устанавіць механізм у адтуліну міны і сілай рукі засунуць настолькі, колькі ён увойдзе ад націску рукі.

Міну трэба закласці знізу ложка, дзе заканчваецца падушка, каб ахвяра целам не давіла на міну, бо тая можа ўперціся ў грудзі ці спіну, але і не пад падушку, бо чалавека можа падкінуць выбухам на падушцы, і ён застанецца жывым і непашкоджаным.

Англійская міна ў дзеянні бязгучная, не цікае, не шыпіць і не пішчыць.

Але вось што цікава. Мазанік да 7 гадзін раніцы прыходзіць на службу ў дом гаўляйтара. Зыходны час — 2 гадзіны ночы. Яна не можа ведаць дакладна, калі закладзе міну. Ці раніцай, ці днём, ці падвечар. Каб прадбачыць, што на 2 гадзіны ночы, трэба браць з сабой цэлы набор механізмаў. А гэта зрабіць у тых умовах было проста немагчыма.

У спакойных абставінах яшчэ можна запусціць міну з 8 гадзін раніцы да 2 гадзін ночы на 18 гадзін. Такіх мін у партызанскім атрадзе «Дима» проста не было. Былі толькі 24-гадзінныя міны. Міну можна пусціць у ход дома, і спакойна (і трэба так сябе трымаць!) ісці на работу. У які час пакласці — значэння не мае. Толькі б закласці ў ложак туды, куды трэба.

Міна, якая знішчыла Кубэ, была накіраванага дзеяння — гэта значыць, разлічаная на ліквідацыю аднаго чалавека; яе падклалі на тое месца, дзе спаў менавіта Кубэ.

І тут узнікае такое далікатнае пытанне: дык адкуль жа дакладна ведала (ці магла ведаць) Мазанік, дзе, на якім баку ложку спаў гаўляйтар, на якой адлегласці лёг спаць так, каб міна якраз была падкладзена пад яго левы бок у раёне сэрца. Вылічыць гэта можна было толькі ведаючы і бачачы, дзе ён клаўся спаць. Значыць, трэба было быць там, каля яго, разам з ім. І непасрэдна бачыць, як ён клаўся спаць на ложак.

Але Мазанік піша, што прыборку ў спальні было даручана рабіць іншай пакаёўцы.

Вось як! А кажуць, партызаны падарвалі Кубэ — аднак яны нават не ведалі размяшчэння пакояў у доме, дзе жыў і працаваў гаўляйтар.

А Мазанік у той час не была ні падпольшчыцай, ні партызанкай!

У ноч, калі быў забіты Кубэ, яго пераемнік К. фон Готберг, адкрыты прыхільнік жорсткіх метадаў ваеннай палітыкі, выклікаў да сябе начальніка паліцыі парадку Э. Герфа, адказных чыноўнікаў СС і СД і абвясціў ім пра неабходнасць бязлітаснага пакарання насельніцтва горада Мінска.

22 верасня (удзень). З мінскай турмы сагналі 300 вязняў у адну камеру, а потым за імі прыехалі «душагубкі». І ў наступныя дні ў Мінску праводзіліся шматлікія карныя акцыі, падчас якіх было схоплена і расстраляна без суда і следства 2000 чалавек, а значна большую колькасць людзей кінулі за краты.

Нацысты жорстка адпомсцілі за смерць генеральнага камісара Беларусі. Пасля забойства Кубэ было расстраляна 300 мінскіх закладнікаў. Усяго за смерць В. Кубэ было знішчана 3 тысячы жыхароў Мінска — ні ў чым не вінаватых людзей! Я ж лічу, што гэта лічба значна заніжана. Ёсць яшчэ і іншыя лічбы: загінулі 6–10 тысяч чалавек!

«Страшные злодеяния в Минске после убийства Кубе были совершены по приказу нашего начальника СС и полиции Готтберга … В последующие дни полицией совместно с СД были проведены облавы. Схваченные на улицах и в домах ни в чем не повинные люди, в том числе женщины и дети, были расстреляны… В этих облавах было расстреляно две тысячи человек, и значительно большее число заключено в концлагерь», — паказаў узяты ў палон 7 мая 1945 года брыгадэнфюрэр СС Э. Герф, які на момант забойства Кубэ ў Мінску быў начальнікам паліцыі парадку ў Беларусі.

22 верасня (удзень). Траян, яшчэ не ведаючы аб смерці Кубэ, прыехала ў Мінск на жаночым нямецкім веласіпедзе, каб аддаць Мазанік міну. Міна ляжала ў каробцы ад торта. Па Мінску ўжо ішлі аблавы, вобыскі і забойствы. Выехаць з Мінску ў яе ўжо не было ніякага шансу. Але дапамог выпадак. Траян сустрэлася з чэхамі — салдатамі вермахта. Настрой у іх быў дрэнны, паразніцкі. Яны дапамаглі жанчыне выйсці з Мінска. Больш таго, да партызанаў разам з ёй пайшоў адзін чэшскі салдат.

23 верасня (чацвер) і ў наступныя дні ў горадзе Мінску паўсюдна праходзілі аблавы.

23 верасня. У Мінску адбылася жалобная паніхіда. У 10 гадзін раніцы труну з целам Вільгельма Кубэ вынеслі з нямецкага ваеннага шпіталя і ўстанавілі на лафеце гарматы. Пад гукі жалобнага маршу працэсія на чале з чатырма сцяганосцамі і ганаровай вартай з прадстаўнікоў вермахта, люфтвафэ і ахоўнай паліцыі накіравалася ў Першы салдацкі дом (даваенны Дом Чырвонай Арміі).

У першых шэрагах ішоў генералітэт на чале з рэйсхкамісарам «Остланд» Лозе, вышэйшыя чыны Генеральнага камісарыята Беларусі і кіраўніцтва НСДАП у Беларусі. Уздоўж вуліц шэрагамі сталі супрацоўнікі цывільнай акупацыйнай адміністрацыі, Мінскай дырэкцыі імперскай чыгункі і Цэнтральнага гандлёвага таварыства «Усход».

Пад гукі нямецкіх народных песень труна была ўнесена на сцэну Франтавога тэатра ў памяшканні Першага салдацкага дома.

Рэйхсміністэрства па справах акупаваных усходніх тэрыторый паведаміла з Берліна, што Гітлер загадаў правесці пахаванне Кубэ на дзяржаўным узроўні.

**Працяг у першым нумары 2012 года.**

АГЛЯД

# КАЛЯДНЫЯ НАДЗЕІ БЕЛАРУСКАГА РОКА

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**У мінулагоднім аглядзе даводзілася канстатаваць, што з розных прычын уплыў лідзіруючых асоб і гуртоў на айчынны рок-рух значана зменшыўся. Склалася ўражанне таго, што нашы вядомыя рок-каманды старой школы кудысьці зніклі, так бы мовіць «агалілі» першы эшалон нацыянальнага рок-руху. Зразумела, у кожнага з музыкаў свае творчыя планы, памкненні і мары. Час праспешвае іх ажыццявіць, але такая нявызначанасць не спрыяе кансалідацыі, якая патрабуецца ў крызісны для айчыннай рок-музыкі час, калі шчыруюць сумнавядомыя «чорныя спісы» выканаўцаў**

І ўсё ж у мінулым годзе некаторыя музыканты, рок-гурты спрабавалі зрабіць творчы рывок, каб запоўніць утвораны вакуум, а разам з гэтым надаць новы імпульс развіццю айчыннага року. Сведчанне гэтаму — новыя альбомы, якія з'віліся напрыканцы года. З некаторымі з іх прапануем пазнаёміцца нашым чытачам.

### «ZNICH»: сюітная форма для экстрыму?

І першым у гэтай падборцы мусім прадставіць доўгачаканы альбом гурта «ZNICH» «Мроя», які не раз анансаваўся як самімі музыкантамі, так і музычнымі аглядальнікамі. «Мроя»— вызначальная праца музыкаў, і ў нейкім сэнсе яна падводзіць вынікі шматгадовай музычнай кар'еры «ZNICH». Музыканты гурта заўсёды былі схільны да складаных формаў у сваіх кампазіцыях, і гэтая праграма не выключэнне. Цяжка сказаць, чаго ў іх pagan-metal больш — фальклорных алюзій, black альбо death-metal, але слухаць альбом патрэбна менавіта цалкам, ад пачатковага філасофскага «Intro» да заключнага рэфлексійнага «Outro».

Імкненне да складаных музычных форм, аранжыровак, да выкарыстання народных інструментаў у кампазіцыях (у прыватнасці, беларускай дуды), наводзяць на думку, што гурт «ZNICH» — тыповы прадстаўнік айчыннага melodic/symphonic pagan-metal, які эвалюцыянуе ад альбома да альбома, знаходзіць новыя музычныя фарбы для больш дасканалага ўвасаблення кампазіцый, усёй канцэпцыі альбомаў гурта. Таму праграму дыска «Мроя» можна разглядаць як своеасаблівую экстрэмальна-музычную сюіту на філасофскую тэму, якая бударажыць наша ўяўленне. Гэта і пошук нацыянальнай тоеснасці, сваіх каранёў («Гэты лёс»), асэнсаванне гістарычнай місіі народа («Вечнасць»), яго даўняй веры і старажытных сакральных сімвалаў («Ярыла», «Крыжы-абярэгі»), якія патрэбна абараняць («Бог вайны»)...

Бадай, адной з самых энергаёмістых кампазіцый альбома, зразумела, стала загалоўная — «Мроя», якая характарызуе аўтарскі погляд музыкаў на з'явы мінулага і яе лучнасці з сённяшнім днём. «ZNICH» заклікае зірнуць на гісторыю нашага народа, асэнсаваць яе і з гэтых пазіцый звярнуцца сённяшняга дня, дзе віруе «вогненны свет жаху і змроку».

Альбом «Мроя» дэманструе, як узрасло выканаўчае майстэрства музыкаў «ZNICH» і іх фронтмэна Алеся Таболіча, якія ўпэўнена заяўляюць пра свае лідарскія амбіцыі, прынамсі ў беларускім pagan-metal.

### Інтрыга ад IQ48

Назваўшы свой трэці альбом без прэтэнзій: «HMR» (ці «Heavy-Metal-Rock»), музыкі гурта IQ48 хацелі падкрэсліць, што іх творы таксама змяняюцца ў бок экстрэмальнага гучання. Дакладней, стандартаў, якія будуць успрымацца не толькі аматарамі hip-hop-культуры, рэп-кора, але і прыхільнікамі metal-музыкі, будуць выконваць функцыю канвергенцыі слухацкай аўдыторыі. А значыць, гэтыя змены будуць спрыяць росту папулярнасці гурта.

Дзеля прагрэсу ў сваёй музыцы ў IQ48 адмовіліся ад саксафона, які доўгі час быў візітоўкай каманды, на карысць новага гітарыста Паўла Яноўскага, які разам з Яўгенам Бузоўскім забяспечыў гурту навізну ў гучанні і аранжыроўках. Бо экстрэмальныя рыфы, сола, драйв і гітарны «кач» якраз і прыцягваюць нашу ўвагу на дыску «HMR». Як, між іншым, і прафесіянальная ігра басіста У. Плюшчава і бубнача А. Мацулевіча, якія ствараюць непаўторны рытмічны малюнак кампазіцый і альбома ў цэлым («Хвост пісталетам», «Рогі і капыты»).

Змены адбыліся не толькі сярод інструменталістаў каманды. Свой унёсак у новую гукавую палітру альбома зрабіў і фронтмэн IQ48 Алесь Ракавец, які цяпер не толькі спрактыкаваны чытальнік рэп-тэкстаў, але і рок-вакаліст. Дзеля пацвярджэння гэтага прапануем праслухаць сумесны трэк «Дай сілы», у якім спяваюць Алесь Ракавец і рэпер Vincent. А вось дуэты Алеся з былым "айк'юшнікам" Паўлам «Фрэйдам» Зыгмантовічам (aka «Пан Жыжма») больш нагадваюць сваім гучаннем кампазіцыі гурта IQ48 пачатковага перыяду. Песні «Эмігрант», «Парыж» распавядаюць пра нялёгкую долю чалавека, які пакінуў Радзіму, выклікаюць пачуццё настальгіі па гадах, калі ўсе яны былі разам і смела эксперыментавалі з аранжыроўкамі, кампазіцыяй, рытмамі рэпа. Зрэшты, як цвёрда паабяцаў Павел, хутка ён разам з сям'ёй вернецца ў Беларусь і будзе імкнуцца ўліцца ў айчынны музычны працэс.

Вельмі важна, што праграма дыска, а асабліва яе літаратурная частка, не мае правальных месцаў:




амаль кожная кампазіцыя альбома «HMR» нясе слухачам пазітыўны пасыл, звяртае яго ўвагу на нейкую сацыяльную праблему, ставіць важнейшыя пытанні, якія хвалююць нашу моладзь, прыхільнікаў айчыннага рок-руху.

### Да папулярнасці — «Partyzon'скімі» сцяжынамі

Нечакана для слухачоў і музычных аглядальнікаў увагу прыцягнуў гурт «Partyzone», які прапанаваў на іх суд свой трэці альбом «Падаць і ўзлятаць». Для яго рэалізацыі музыкам спатрэбілася каля шасці гадоў. За гэты час адбыліся змены ў гучанні, хоць аснова — рок-н-ролл, hard-rock — засталася некранутай. Таксама, як і тэксты гурта, якія насычаны заглыбленымі, моцнымі сімвалічнымі вобразамі. Хоць у адрозненне ад альбома «Трэба рабіць» на новай кружэлцы зусім не стала сатырычных і гумарыстычных замалёвак. Гэта збядняе лірычную палітру гурта.

Уражанне пра тое, што ўяўляе сабой гурт «Partyzone», сёння можна атрымаць з уступнай кампазіцыі альбома «Розум», у якой традыцыйны «цяжкі» меладызм аздабляецца элементамі псіхадэліі. З дапамогай электронных інструментаў, незвычайных гітарных эфектаў ствараецца гукавая карціна напружанай працы ўсёй нервовай сістэмы чалавека.

Даўно вядома цяга гітарыста гурта «Partyzone» Яўгена Цылікава да цытавання класічных мелодый. Вось і на дыску «Падаць і ўзлятаць» у кампазіцыі «Богі далі ім імя» гучыць тэма «Танцы рыцараў» Сяргея Пракоф'ева. На жаль, нідзе на дыску цытата не пазначана, у адрозненне ад альбома «HMR» гурта IQ48, дзе ў кампазіцыі «Парыж» гучыць тэма Эдзіт Піяф. Дадатковыя музычныя звесткі маглі б служыць развіццю кругагляду слухачоў. Музыканты гурта «Partyzone» неяк не звярнулі ўвагу на гэты важны аспект.

Затое лідар гурта і гітарыст Яўген Цылікаў знаходзіць цікавыя музычныя фарбы, каб зрабіць сваю музыку больш разнастайнай. Так, у меладычнай кампазіцыі "Далеч кліча" выкарыстоўваецца джазавая гітарная імправізацыя, чысты тэмбр інструмента. У такой змрочнай музычнай атмасферы, якая пануе ў гэтым спеве, гітара стварае альтэрнатыўную рэальнасць святла і надзеі.

Калі гаварыць пра станоўчае ў музыцы гурта «Partyzone», дык трэба адзначыць іх спробы з дапамогай сродкаў «цяжкай» рок-музыкі актуалізаваць хрысціянскую тэматыку. Тры апошнія кампазіцыі альбома («У памяці маёй», «Вера», «Мы ляцім») створаны пад уплывам узнёслых гармоній сакральных песнапенняў, але з акцэнтамі, характэрнымі для рок-музыкі. Тут адчувальныя і меладычныя кантрасты, прыцягваюць увагу ўступы акустычнай гітары, сімфа-рокавае развіццё тэмы, узнёслы спеў Дзяніса Вячэрскага.

У цэлым жа альбом «Падаць і ўзлятаць» ад гурта «Partyzone» стварае больш творча разнастайны вобраз знаёмага гурта — пераможцы «Басовішча–2002». Хоць і не выводзіць каманду ў бясспрэчныя лідары айчыннай рок-музыкі. Затое «ZNICH» сваім альбомам «Мроя» зрабіў значны прарыў да вяршынь айчыннага metal-алімпу, які ў свой час яны пачэсна займалі, карыстаючыся сваім станаў піянераў беларускага цяжка-экстрэмальнага накірунку.

Найбольш перспектыўным для беларускіх слухачоў падаецца новая праца «HMR» гурта IQ48. На яго трэках адчуваецца крэатыў у стылістычным сінтэзе рока і hip-hop-рытмаў. Галоўнае — гэтыя стылістычныя пошукі дапамагаюць музыкантам весці дыялог з моладдзю, якая бачыць у IQ48 шчырых выканаўцаў, чые песні становяцца блізкімі многім маладым беларусам.

Да сустрэчы ў 2012 годзе на сцэне канцэртнай залы «Мінск»!






АБ'ЯВА

# МЫ — У ЦЭНТРЫ!

Новы Час

**Калі бываеце ў цэнтры Мінску, дык найбольш зручна набываць свежы нумар «Новага Часу» ў кнігарні «логвінаЎ» на праспекце Незалежнасці 37А.**





ФЕСТЫВАЛЬ

# TERRA NOVA

Мікіта БРОЎКА

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё III Міжнароднага фестывалю лічбавага мастацтва «Terra Nova».**

Ужо ў трэці раз у галерэйным комплексе Нацыянальнай бібліятэкі прадстаўляюцца працы, выкананыя выключна ў лічбавым фармаце. Традыцыйна фестываль не абмяжоўваецца візуальным мастацтвам: акрамя пастаяннай экспазіцыі лічбавага фота і кампутарнай графікі адбудуцца паказы відэа-арту, рэкламных ролікаў, музычных кліпаў, анімацыі і кароткаметражных фільмаў.

Вынікі фестывалю падсумуе конкурс, пераможцаў якога вызначыць журы ў складзе кінарэжысёра Аляксандра Яфрэмава, куратара Фёдара Ястраба, дызайнера Аляксандра Шчэпікава, фотамастака Валерыя Вядрэнкі, рэжысёра-аніматара Аляксандра Ленкіна і дызайнера Антона Баранава. Творы будуць разглядацца ў намінацыях «Лічбавае фота», «Кампутарная графіка», «Лічбавы жывапіс», «Відэа-арт», «Відэакліп музычны», «Анімацыя», «Рэкламны ролік» і «Кароткі метр».

Выстава працягнецца да 18 студзеня і скончыцца ўручэннем дыпломаў пераможцам конкурсу і канцэртам электроннай музыкі.







## Паведамленне Пасольства Германіі

### Новая сістэма запісу для падачы заяў на атрыманне віз у Пасольстве Германіі ў Мінску

З 10 студзеня 2012 года візавы аддзел Пасольства Германіі ў Мінску пераходзіць на электронную сістэму запісу для падачы заяў на атрыманне віз праз інтэрнэт. Для гэтага трэба зайсці на сайт Пасольства **www.minsk.diplo.de**, дзе будзе размешчана інфармацыя аб магчымых тэрмінах падачы дакументаў, і зарэзерваваць прымальны для Вас дзень і дакладны час наведвання візавага аддзела.

Новая сістэма ўводзіцца для таго, каб у будучым пазбегнуць вялікіх чэргаў у візавым аддзеле.

**Выключэнні:**
Асобы, якія не маюць доступу да інтэрнэта, могуць пасля 10.01.2012 г. узгадняць час падачы дакументаў па тэлефоне (па аўторках і чацвяргах з 09.00 да 11.00, пры гэтым запіс па тэлефоне абмежаваны і не ажыццяўляецца на больш ранні тэрмін, чым праз інтэрнэт).
Групам болей за 5 чалавек просьба запісвацца для падачы дакументаў таксама па тэлефоне.

Запіс па новай сістэме будзе ажыццяўляцца бясплатна.

Пры падачы дакументаў, як і раней, спаганяецца толькі збор за апрацоўку заявы, што складае, як правіла, 60 еўра.



Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП "Плутас-Маркет". г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.
Замова № 1260

Падпісана да друку 16.12.2011. 8.00.
Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.